Лявон Баршчэўскі

СУЧАСНЫ КАРОТКІ
ЛІТОЎСКА-БЕЛАРУСКІ
І БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІ СЛОЎНІК

Dabartinis trumpas
lietuvių-baltarusių, baltarusių-lietuvių kalbų
žodynas

Лявон Баршчэўскі

СУЧАСНЫ КАРОТКІ ЛІТОЎСКА-БЕЛАРУСКІ І БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІ СЛОЎНІК

Dabartinis trumpas lietuvių-baltarusių, baltarusių-lietuvių kalbų žodynas

Больш за 10 000 + 13 000 загалоўных слоў
Viršum 10 000 + 13 000 antraštinių žodžių

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2021

УДК 811.172'374=161.3+811.161.3’374=172
ББК 81.2Лит-4
Б26

Пад рэдакцыяй Вінцука Вячоркі, Алеся Мікуса
Redagavo V. Viačorka, A. Mikus

Кансультант Ян Шупа
Konsultantas Jan Šupa

Слоўнік падрыхтаваны пры спрыянні
Амбасады Літоўскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь
Žodyno rengimą rėmė Lietuvos Respublikos ambasada
Baltarusijos Respublikoje

Баршчэўскі, Л.
Б26 Сучасны кароткі літоўска-беларускі і беларуска-літоўскі слоўнік = Dabartinis trumpas lietuvių-baltarusių, baltarusių-lietuvių kalbų žodynas / Лявон Баршчэўскі. — Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2021. — 464 с.
ISBN 978-985-23-0152-7.

Слоўнік уяўляе сабой першую спробу стварэння папулярнага практычнага літоўска-беларускага і беларуска-літоўскага слоўніка. У выглядзе адпаведных пазнак і табліц пададзены мінімум самай неабходнай граматычнай інфармацыі.
Адрасуецца шырокаму колу чытачоў.

ББК 81.2Лит-4
УДК 811.172'374=161.3+811.161.3’374=172

ISBN 978-985-23-0152-7

УСТУПНАЕ СЛОВА

Беларусь звязана з Літвою больш шчыльна, чым з любой іншай краінай: абедзве зямлі не толькі знаходзяцца побач, але і стагоддзямі складалі адзіную дзяржаву – Вялікае Княства Літоўскае. Іх мовы не надта падобныя паміж сабою, але яны маюць мноства дачыненняў і супольнай лексікі, з’яўленне якой у абедзвюх мовах сягае гістарычных часоў рознай глыбіні. Як ні дзіўна, досыць ёмісты і прафесійна падрыхтаваны літоўска-беларускі і беларуска-літоўскі слоўнік з’яўляецца толькі цяпер. Ён абавязкова прынясе карысць абодвум народам і стане адным з сімвалаў іх даўніх стасункаў, якія заўсёды развіваліся ў духу блізкасці ды сімпатыі і, несумненна, будуць гэтак развівацца і надалей.

Праф. Томас Вянцлава
Ліпень 2021 г.

АД СКЛАДАЛЬНІКА

Суседняя і гістарычна блізкая нам Літва заўсёды была, ёсць і, спадзяюся, застанецца ў будучыні краінай, якую з асаблівай ахвотай наведвалі, наведваюць і будуць наведваць беларусы. Сярод вялікай колькасці літоўцаў існуе салідарнае разуменне агульнасці лёсаў і перспектыў абодвух нашых народаў, а таксама таго факту, што без усёабдымнай падтрымкі і спрыяння развіццю роднай мовы будучыня краіны можа быць пад пагрозай.

Гэты Слоўнік уяўляе сабой першую спробу стварэння папулярнага практычнага літоўска-беларускага і беларуска-літоўскага слоўніка, з дапамогай якога найперш беларус, апынуўшыся ў Літоўскай Рэспубліцы, не згубіцца ў моры літоўскамоўнай тэкставай інфармацыі і, у сваю чаргу, здолее сфармуляваць элементарныя фразы па-літоўску. У пэўнай меры Слоўнікам могуць скарыстацца літоўцы, якія цікавяцца беларускай мовай. Практычная скіраванасць гэтай працы абумовіла дбайны выбар базавай лексікі сучасных літоўскай і беларускай моў; пры гэтым складальнік імкнуўся пакідаць па-за яе межамі тыя літоўскія лексічныя адзінкі, якія могуць быць без перакладу зразумелыя беларускаму карыстальніку. Дзеля ашчаджэння месца ў Слоўніку таксама пададзены спіс фармантаў, з дапамогай якіх апошні можа здагадацца пра асноўнае значэнне значнай колькасці слоў, што непасрэдна не ўключаны ў склад Слоўніка. Пададзены ў выглядзе адпаведных пазнак і табліц мінімум самай неабходнай граматычнай інфармацыі служыць той самай мэце.

Складальнік і выдавец хацелі б у гэтым месцы выказаць шчырую падзяку ініцыятару выдання Паўлу Жуку, рэдактарам Слоўніка Вінцуку Вячорку і Алесю Мікусу, кансультанту Яну Шупу, аўтару ўступнага слова знакамітаму літоўскаму паэту і філолагу, прафесару Томасу Вянцлаве, філолагу і літаратурнаму перакладчыку Сяргею Шупу, настаўніцы Віленскай гімназіі імя Францішка Скарыны Алене Базюк, а таксама Амбасадзе Літоўскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь, якая ад самага пачатку падтрымлівала ідэю ажыццяўлення гэтага праекта.

ЯК КАРЫСТАЦЦА СЛОЎНІКАМ

Усе загалоўныя словы ў абедзвюх частках Слоўніка размешчаны (з нязначнымі адхіленнямі) у алфавітным парадку. Укладальнік імкнуўся не ўключаць у склад Слоўніка лёгкаўтваральныя словы. Прыслоўі, утвораныя ад прыметнікаў, падаюцца ў абмежаванай колькасці. Паколькі Слоўнік прызначаны галоўным чынам для беларускага карыстальніка, націскі рэгулярна падаюцца толькі для літоўскіх слоў.

Умоўны знак ~ (тыльда) замяняе або загалоўнае слова цалкам, або яго частку, што стаіць перад знакам **|** (вертыкальная лінія), калі такі знак у гэтым слове маецца. Напрыклад: **reg|à** (4) зрок; бачанне; **~éti** (rẽgi, ~ė́jo) [*чытаецца:* **regė́ti (rẽgi, regė́jo)**] бачыць; **абед** piẽtūs (4) *мн. л.*; **па ~зе** [*чытаецца:* **па абедзе**] popiẽt; **раніца** rýtas (3), rytmetỹs (3[a]); **~й** [*чытаецца:* **раніцай**] rýtą.

Сінонімы і блізказначныя словы ў слоўнікавых артыкулах раздзяляюцца паміж сабою коскамі, паміж амонімамі і аддалена роднаснымі словамі звычайна ставіцца кропка з коскай. У літоўска-беларускай частцы Слоўніка для размежавання амонімаў ужываюцца таксама рымскія лічбы.

Асобныя словы, а таксама значэнні слоў пры неабходнасці пазначаны тлумачэннямі, што падаюцца *курсівам* у круглых дужках. У круглых дужках, але без курсіву падаюцца словы або часткі слоў, якія з’яўляюцца факультатыўнымі або дазваляюць у скарочаным выглядзе падаць сінанімічныя шэрагі значэнняў. Адмысловыя ўказанні на кіраванне дзеяслова падаюцца ў тых выпадках, калі пры перакладзе іх на беларускую або, адпаведна, літоўскую мову кіраванне выразна не супадае.

Літоўскі алфавіт
і правілы вымаўлення

Асобныя літары і іх чытанне

(Знак **:** пазначае доўгае вымаўленне адпаведнага галоснага, знак **’** – мяккасць адпаведнага зычнага; зычныя вымаўляюцца мякка перад галоснымі **e, ę, ė, i, į, y,** а таксама перад наступнымі мяккімі зычнымі; зычныя **b, d, g, z, ž, dz, dž** аглушаюцца ў сярэдзіне слоў перад наступнымі глухімі зычнымі і ў фінальнай пазіцыі ў слове).

A a – **[а]**
Ą ą – **[а:]**
B b – **[б]**, **[б’], [п]**
C c – **[ц]**, **[ц’]**
Č č – **[ч]**, **[ч’]** (апошні вымаўляецца мякка, падобна да рускага **ч**)
D d – [д], [д’] (апошні вымаўляецца як мяккі рускі або ўкраінскі **д**), **[т]**
E e – **[э]** (адкрыты гук, у сярэдзіне і напрыканцы незапазычаных слоў пасля змякчанага зычнага вымаўляецца блізка да беларускага **[а]**)
Ę ę – **[э:]** (вымаўляецца паводле тых жа правіл, што і **e** – толькі больш доўга)
Ė ė – **[е:]** (вымаўляецца вузка, паміж **[э]** і **[і]**)
F f – **[ф]**, **[ф’]**
G g – **[г]**, **[г’]** (вымаўляюцца як рускія цвёрды і мяккі **г**), **[к]**
H h – **[г]**
I i – **[і]**, **Į į** – **[і:]**, **Y y** – **[і:]**
J j – **[й]**
K k – **[к]**, **[к’]**
L l – **[л]**, **[л’]**
M m – **[м]**, **[м’]**
N n – **[н]**, **[н’]**
O o – **[о]** (вымаўляецца нязменна таксама не пад націскам)
P p – **[п]**, **[п’]**
R r – **[р]**, **[р’]**
S s – **[с]**, **[с’]**

Š š – **[ш]**, **[ш’]** (апошні вымаўляецца падобна да польскага ś)

T t – **[т]**, **[т’]** (апошні вымаўляецца як мяккі рускі або ўкраінскі **т**)

U u – **[у]**

Ų ų, **Ū ū** – **[у:]**

V v – **[в]**, **[в’]**

Z z – **[з]**, **[з’]**

Ž ž – **[ж]**, **[ж’]** (апошні вымаўляецца падобна да польскага **ź**)

Чытанне асаблівых спалучэнняў літар

Ch, **ch – [х]**, **[х’]**

Dz, **dz – [дз]**, **[дз’]**

Dž, **dž – [дж]**, **[дж’]** (апошні вымаўляецца падобна да польскага **dź**).

Чытанне дыфтонгаў (двугалосных)

Дыфтонгі (**ai, au, ei, eu, ie, oi, ui, uo**) сустракаюцца перад зычнымі гукамі, у пачатку або напрыканцы слова; яны могуць быць пад націскам або ненаціскнымі, але заўсёды ўтвараюць адзін склад.

ai – **[ай]** (пад націскам вымаўляецца як **[эй]** або **[ей]**)

au – вымаўленне паміж **[ыў]** і **[эў]**

ei – **[ей]** (першы гук, неётаваны, вымаўляецца вузка)

eu – **[еў]** (першы гук, неётаваны, вымаўляецца вузка; дыфтонг сустракаецца толькі ў запазычаных словах)

ie – **[iᵉ]** (вымаўляецца прыблізна як англійскае ***ea*** ў слове ***dear***; падобна да беларускага напружанага вымаўлення націскнога **[е]**, асабліва ў паўднёва-заходніх гаворках)

oi – **[ой]** (сустракаецца толькі ў запазычаных словах)

ui – **[уй]**

uo – **[уᵃ]** (вымаўляецца прыблізна як англійскае ***oer*** у слове ***doer***; падобна да беларускага напружанага вымаўлення націскнога **[о]**, асабліва ў паўднёва-заходніх гаворках).

Асаблівасці падачы некаторых часцін мовы ў слоўніку

Назоўнікі літоўскай мовы, якія могуць абазначаць жывых істот як мужчынскага, так і жаночага полу, звычайна дзеля ашчаджэння месца падаюцца толькі ў форме мужчынскага роду. Для назоўнікаў жаночага роду, якія заканчваюцца на *ненаціскное* **-is**, у беларуска-літоўскай частцы Слоўніка пасля ўказання на нумар націскавай парадыгмы ў круглых дужках падаецца таксама іх канчатак роднага склону адз. л. – **-ies**. Маецца на ўвазе, што што ўсе астатнія назоўнікі, што заканчваюцца на **-is**, належаць або да мужчынскага роду і маюць канчатак **-io**, або да жаночага роду (з націскным **-ìs**) і маюць, адпаведна, канчатак **-iẽs**, які адмыслова ў Слоўніку не падаецца.

Літоўскія *дзеясловы* ў абедзвюх частках Слоўніка, як гэта традыцыйна прынята, падаюцца ў дужках праз коску ў трох формах: інфінітыва, а таксама трэцяй асобы адзіночнага ліку, адпаведна, цяперашняга і прошлага аднаразовага часу. *Зваротныя* дзеясловы з фармантамі **-s, -si, -is** у беспрыстаўкавых формах і фармантам **-si-**, які ўстаўляецца ў прыстаўкавыя формы (пасля прыстаўкі), уключаныя ў склад слоўніка звычайна толькі ў тых выпадках, калі іх сэнс не вынікае непасрэдна са стандартнай незваротнай формы або калі апошняй не існуе.

Паколькі ў літоўскай мове катэгорыя трывання дзеяслова ў прынцыпе мае семантычны, а не марфалагічны характар, а беларускаму карыстальніку Слоўніка нескладана ўтвараць формы закончанага трывання дзеясловаў ад формаў незакончанага трывання, то, дзеля ашчаджэння месца, пераклад літоўскіх дзеясловаў падаецца тут, як правіла, у незакончаным трыванні. Выняткі складаюць тыя літоўскія дзеясло-

вы (напр., з суфіксамі інфінітыва **-elti, -elėti, -erti, -erėti** або з пэўнымі прыстаўкамі), якія ў сваёй семантыцы маюць закладзенае менавіта закончанае трыванне.

Тыповыя значэнні некаторых фармантаў слоў

-a канчатак вялікай колькасці назоўнікаў жаночага роду ў назоўным склоне; у іх лік уваходзяць шматлікія інтэрнацыянальныя словы, у якіх, у адрозненне ад беларускай мовы, націск падае на апошні склад (яны адносяцца да 2-й націскавай парадыгмы): afišà, Argentinà, bibliotekà, centrifugà, damà, eskadrà, fanfarà, Ganà, hidrà, intrigà, jachtà, kobrà, kometà і да т. п.; гэта *тс.* адзін з канчаткаў прыметнікаў безыменнага (ніякага) роду, што ўжываюцца ў сказе ў ролі акалічнасцяў спосабу дзеяння: ***gẽra*** *добра*, ***šálta*** *холадна* і да т. п.;

-ai *гл.* іаї;

-aip фінальны фармант прыслоўяў за значэннем «нейкім чынам», «нейкім спосабам», напрыклад: ***visaĩp*** *усяляк*, *усялякім спосабам*;

ap(i)- прыстаўка, якая часта выкарыстоўваецца ў значэнні, адпаведным беларускай прыстаўцы *а(б)-*, напрыклад: ***aprašýti*** *апісваць* (параўн.: ***rašýti*** *пісаць*);

apy- прыстаўка: у прыметніках часта паказвае на набліжэнне нейкай якасці, у назоўніках на наваколле, атачэнне чаго-н., каго-н., напрыклад: ***apýkaklė*** *каўнер* (параўн.: ***kãklas*** *шыя*);

-as ненаціскны канчатак вялікай колькасці назоўнікаў мужчынскага роду ў назоўным склоне;

at(a)- прыстаўка: часта выкарыстоўваецца ў значэнні набліжэння, адлучэння, дзеяння ў адказ, вяртання, напрыклад: ***atsakýti*** *адказваць* (параўн.: ***sakýti*** *казаць*); ***ãtspalvis*** *адценне* (параўн.: ***spalvà*** *колер*);

be- часта адпавядае белару-

скай прыстаўцы *без-* (*бяз-*), напрыклад: ***begiñklis*** *бяззбройны* (параўн.: ***giñklas*** *зброя*);

daug-, daugia- першая частка ў складаных словах са значэннем *шмат-*, *многа-*/*многа-*, напрыклад: ***daugkar̃t*** *шмат разоў, неаднаразова* (параўн.: ***kar̃tas*** *раз*);

-ė канчатак назоўнага склону многіх назоўнікаў жаночага роду і некаторых – мужчынскага ў назоўным склоне;

-ėjas, ėja фарманты, якія дадаюцца да дзеяслоўнай асновы і звычайна абазначаюць выканаўцу дзеяння – адпаведна, мужчынскага і жаночага роду;

-elė, -ėlė суфіксы з памяншальным значэннем для назоўнікаў жаночага роду, напрыклад: ***stotẽlė*** *прыпынак* (параўн.: ***stotìs*** *станцыя*);

-elis, -ėlis тое самае для назоўнікаў мужчынскага роду, напрыклад: ***indẽlis*** *малая пасудзіна* (параўн.: ***iñdas*** *пасудзіна*);

-ęs канчатак назоўнага склону адзіночнага ліку дзеепрыметніка незалежнага стану мужчынскага роду ў прошлых часах, напрыклад: ***bė́gęs*** *які пабег*; ***dìrbdavęs*** *які працаваў*;

-esn- суфікс, з дапамогай якога ўтвараецца вышэйшая ступень якаснага прыметніка, напрыклад: ***gerèsnis*** *лепшы* (параўн.: ***gẽras*** *добры*);

į- дзеяслоўная прыстаўка, якая найчасцей указвае на скіраванасць адпаведнага дзеяння ўсярэдзіну, унутр, напрыклад: ***įpìlti*** *заліваць, засыпаць унутр* (параўн.: ***pìlti*** *ліць, сыпаць*);

-iai фармант, які можа быць не толькі канчаткам іменных часцін мовы ў назоўным склоне множнага ліку, але і суфіксам, з дапамогай якога ад адпаведных прыметнікаў утвараецца прыслоўе, напрыклад: ***gražiaĩ*** *прыгожа* (ад ***gražùs*** *прыгожы*);

-iaus- суфікс, з дапамогай якога ўтвараецца найвышэйшая ступень якаснага прыметніка, напрыклад: ***geriáusias*** *найлепшы* (параўн.: ***gẽras*** *добры*);

-iena фармант за значэннем матэрыялу, рэчыва, з якога ўтвораны іншы матэрыял або рэчыва (у т. л. мяса жывых істот), напрыклад: ***medíena*** *драўніна* (параўн.: ***mẽdis*** *дрэва*); ***kiaulíena*** *свініна*; (параўн.: ***kiaũlė*** *свіння*)

ilga- фармант, які ўтварае першую частку складаных слоў і мае значэнне *даўга-*/*доўга-*, напрыклад: ***ilgakõjis*** *даўганогі*;

-ininkas, -ininkė фарманты, якія дадаюцца да асновы слова і звычайна абазначаюць выканаўцу дзеяння – адпаведна, мужчынскага і жаночага роду;

-is канчатак назоўнага склону некаторых назоўнікаў абодвух родаў;

iš- дзеяслоўная прыстаўка, абазначае дзеянне, скіраванае вонкі (прыблізна як беларускія прыстаўкі *вы-*, *з-*, *с-*, *са-*, *ад-*), або давяршэнне нейкага дзеяння (беларускія прыстаўкі *раз-*, *рас-*) напрыклад: ***išvažiãvimas*** *выезд* (параўн.: ***važiãvimas*** *язда*); ***išpardúoti*** *распрадаваць* (параўн.: ***pardúoti*** *прадаваць*);

-išk- суфікс прыметнікаў, які часта адпавядае беларускім суфіксам **-ск-, -цк-**, напрыклад: ***bróliškas*** *братэрскі* (параўн.: ***brólis*** *брат*);

-ius *гл.* **-us**;

įvairia- фармант, які ўтварае першую частку складаных слоў і мае значэнне *розна-*, *разна-*, напрыклад: ***įvairiaspal̃vis*** *рознакаляровы*;

-m- суфікс, які ўжываецца для ўтварэння дзеепрыметнікаў залежнага стану ў цяперашнім часе, напрыклад: ***mylímas*** *каханы* (ад ***mýli*** *кахае*);

ne- на пачатку слова збольшага адпавядае беларускім *не-* (*ня-*) або *без-* (*бяз-*), напрыклад: ***nebūtìs*** *небыццё*; ***negailestìngas*** *бязлітасны*;

-nt-, -nt суфікс, адпаведна, дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў незалежнага стану, напрыклад: ***dìrba*** *працуе* – ***dìrbantis*** *які, якая працуе*; ***dìrbant*** *працуючы*;

pa- прыстаўка, якая шмат якім літоўскім дзеясловам надае значэнне завершанасці дзеяння, напрыклад: ***pagulė́ti*** *паляжаць* (параўн.: ***gulė́ti*** *ляжаць*); таксама ў розных часцінах мовы можа адпавядаць беларускай прыстаўцы *пад*-, напрыклад: ***pakal̃nė*** *падножжа гары* (параўн.: ***kálnas*** *гара*);

per- прыстаўка дзеясловаў і ўтвораных ад іхназоўнікаў, якой у беларускай мове найчасцей адпавядае прыстаўка *пера*-, напрыклад: ***pérklausti*** *перапытаць* (параўн.: ***kláusti*** *пытаць*);

pilna- фармант, які ўтварае першую частку складаных слоў і мае значэнне *паўна*-/*поўна*-, напрыклад: ***pilnamẽtis*** *паўнагадовы*;

pirma- фармант, які ўтварае першую частку складаных слоў і мае значэнне *перша*-, напрыклад: ***pirmamẽtis*** *першагадовы*;

po- дзеяслоўная прыстаўка, значэнне якой можа адпавядаць беларускім *па*-, *пасля*- або *пад*-, напрыклад: ***porinkìminis*** *пасьлявыбарчы*, ***pórūšis*** *падвід*;

pri- дзеяслоўная прыстаўка, значэнне якой часта супадае са значэннем беларускіх *пры*-, *да*- або *на*-, напрыклад: ***priei͂ti*** *прыйсці* (параўн.: ***ei͂ti*** *ісці*); ***priskrìsti*** *прыляцець, даляцець* (параўн.: ***skrìsti*** *ляцець*);

prieš- прыстаўка за значэннем *проці*-, *супраць*-, напрыклад: ***priešgaisrìnis*** *проціпажарны* (параўн.: ***gai͂sras*** *пажар*);

pro- прыстаўка розных часцін мовы, значэнне якой часта адпавядае беларускай прыстаўцы *пра*- ў розных яе значэннях, напрыклад: ***prósenelis*** *прадзед* (параўн.: ***senẽlis*** *дзед*);

próskyna *прасека* (параўн.: ***skìnti*** *сячы*);

pus- прыстаўка, якая звычайна мае значэнне *напалову*, *палова*, *паў-*, напрыклад: ***pùsgyvis*** *паўжывы* (параўн.: ***gỹvis*** *жывая істота*);

-s, -si варыянты часціцы, якая ставіцца напрыканцы дзеяслова дзеля надання яму значэння зваротнасці, напрыклад: ***orientúotis*** *арыентавацца* (параўн.: ***orientúoti*** *арыентаваць*);

sam-, san- варыянты прыстаўкі розных часцін мовы, значэнне якой часта адпавядае беларускім прыстаўкам *су-*, *са-*, *з-*, напрыклад: ***sámbūris*** *зборня, зборышча*; ***sándrauga*** *супольнасць*;

sava- пачатковы фармант розных часцін мовы, значэнне якога збольшага адпавядае значэнню беларускага фарманта *сама-*; параўн., напрыклад: ***dárbas*** *праца* і ***savadar̃bis*** *самаробны*;

-siant- фармант, які ўжываецца для ўтварэння формаў дзеепрыметніка незалежнага стану будучага часу, напрыклад: ***dìrbsiantis*** *які будзе працаваць*; ***dìrbsianti*** *якая будзе працаваць*;

-sim- фармант, які ўжываецца для ўтварэння формаў дзеепрыметніка залежнага стану будучага часу, напрыклад: ***bū́ti*** *быць – **bū́simas** які будзе, будучы*;

su- прыстаўка дзеясловаў і ўтвораных ад іх назоўнікаў ды іншых часцін мовы, якой у беларускай мове найчасцей адпавядаюць прыстаўкі *з-* (*с-, са-, су-*), *за-* або *па-*, напрыклад: ***sutìkti*** *сустракаць*; ***sutrámdymas*** *замірэнне, суняццё*; ***sutèpti*** *запэцкаць*; *sutrukdýti патурбаваць*;

susi- пачатковы фармант у тых жа часцінах мовы са зваротным значэннем, напрыклад: ***susitìkti*** *сустракацца* (параўн.: ***sutìkti*** *сустракаць*); ***susimaišýti*** *змешвацца* (параўн.: ***su-***

maišýti *змешваць*); ***susisukìmas*** *скручванне* (параўн.: ***susùkti*** *скручваць* і ***susisùkti*** *скручвацца*);

šun- пачатковы фармант слова (звычайна назоўніка), які сведчыць пра несапраўднасць, адмоўную якасць абазначанага гэтым словам паняцця; параўн., напрыклад: ***grỹbas*** *грыб* і ***šùngrybis*** *неядомы грыб*;

-t- суфікс дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу, параўн.: ***dãro*** *ён, яна робіць* – ***darýtas*** *(раней) зроблены*; ***mýli*** *ён, яна кахае* – ***mylė́tas*** *каханы*;

tarpu- пачатковы фармант розных часцін мовы, значэнне якога збольшага адпавядае значэнню беларускага фарманта *між-*; параўн., напрыклад: ***eilùtė*** *радок* і ***tarpùeilis*** *міжрадкоўе*; ***mìškas*** *лес* і ***tarpùmiškis*** *міжлессе, пералесак*;

-ti суфікс дзеяслоўнага інфінітыва;

-tin- суфікс дзеепрыметнікаў павіннасці, параўн.: ***dìrbti*** *рабіць* і ***dìrbtinas*** *які, якую трэба (з)рабіць*;

-tojas, -toja фарманты, якія дадаюцца да дзеяслоўнай асновы і звычайна абазначаюць выканаўцу дзеяння – адпаведна, мужчынскага і жаночага роду;

trumpa- пачатковы фармант розных часцін мовы, значэнне якога збольшага адпавядае значэнню беларускага фарманта *каротка-*; параўн.: напрыклад: ***uodegà*** *хвост* і ***trumpauodẽgis*** *кароткахвосты*;

-tų суфікс дзеяслоўнай формы супіна (мэтавіка), якая ўжываецца пасля дзеясловаў руху, напрыклад: ***žmonà išbė́go uogáutų*** *жонка пабегла збіраць ягады*.

-u адзін з канчаткаў прыметнікаў безыменнага (ніякага) роду, што ўжываюцца ў сказе ў ролі акалічнасцяў спосабу дзеяння: ***gražù*** *прыгожа*, ***sunkù*** *цяжка* і да т. п.;

-ukas памяншальны фармант, які абазначае таксама і малых жывых істот, напрыклад: ***berniùkas*** *хлопчык* (параўн.: ***bérnas*** *малады чалавек, хлапец*);

-uo канчатак назоўнага склону некаторых назоўнікаў мужчынскага роду і адзінага назоўніка жаночага роду – ***sesuõ*** *сястра*;

-uoti суфікс дзеяслоўнага інфінітыва, які мае значэнне, блізкае да беларускіх *-оўваць* або *-аваць*, напрыклад: ***dainúoti*** *апяваць* (параўн.: ***dainà*** *песня, спеў*).

-us фармант, які можа ўяўляць сабою як канчатак мужчынскага роду некаторых назоўнікаў або прыметнікаў, так і суфікс дзеепрыслоўяў прошлых часоў;

-usi канчатак назоўнага склону адзіночнага ліку дзеепрыметнікаў незалежнага стану жаночага роду ў прошлых часах, напрыклад: ***bė́gusi*** *якая пабегла*; ***dìrbdavusi*** *якая працавала*;

-utė памяншальны фармант назоўнікаў жаночага роду, які абазначае таксама і малых жывых істот, напрыклад: ***dėžùtė*** *скрыначка, каробачка* (параўн.: ***dėžẽ*** *каробка; скрынка*); ***mamùtė*** *мамуся* (параўн.: ***mamà*** *мама*);

už- прыстаўка дзеясловаў і ўтвораных ад іх назоўнікаў ды іншых часцін мовы, якой у беларускай мове найчасцей адпавядае прыстаўка *за-* (радзей прыстаўкі *на-*, *па-*), напрыклад: ***užtrìnti*** *зацерці* (параўн.: ***trìnti*** *церці*), ***Ùžupis*** *Зарэчча* (*гістарычны раён у Вільні* – параўн.: ***ùpė*** *рака*);

vid(u)- прыстаўка са значэннямі *палова*, *сярэдзіна*; параўн., напрыклад: ***dienà*** *дзень* і ***vidùdienis*** *сярэдзіна дня*;

vien(a)- пачатковы фармант розных часцін мовы, значэнне якога збольшага адпавядае значэнню беларускага фарманта *адна-*; параўн., напрыклад: ***tòmas***

том і ***vienatòmis*** *аднатамовы*;

virš(u)- прыстаўка са значэннямі *над-*, *звыш-*; параўн.: напрыклад: ***klasìnis*** *класавы* і ***viršklasìnis*** *надкласавы*; ***garsìnis*** *гукавы* і ***viršgarsìnis*** *звышгукавы*;

visa- пачатковы фармант розных часцін мовы, значэнне якога збольшага адпавядае значэнню беларускага фарманта *усе-* (*усё-, уся-*); параўн., напрыклад: ***galýbė*** *магутнасць* і ***visagalýbė*** *усёмагутнасць*.

Скарачэнні

адз. л. адзіночны лік, адзіночнага ліку
ас. асоба
безасаб. безасабовая форма
він. скл. вінавальны склон
выклічн. выклічнік
выш. ст. вышэйшая ступень
гл. глядзець
дав. скл. давальны склон
дзеепрым. дзеепрыметнік
дзеепрысл. дзеепрыслоўе
ж. р. жаночы род
займ. займеннік
займ. прым. займенны прыметнік
зборн. зборнае паняцце
злучн. злучнік
лічэбн. лічэбнік
м. р. мужчынскі род
м. скл. месны склон
мн. л. множны лік, множнага ліку
-н. -небудзь (*часціца*)
назоўн. назоўнік
найвыш. ст. найвышэйшая ступень
напр. напрыклад
незм. незмяняльнае
пабочн. сл. пабочнае слова (пабочная канструкцыя)
прым. прыметнік
прыназ. прыназоўнік
прысл. прыслоўе
р. скл. родны склон
тв. скл. творны склон
тс. таксама
ув. сл. уводнае слова (уводная канструкцыя)
у розн. знач. у розных значэннях
у т. л. у тым ліку
часц. часціца

ЛІТОЎСКА-БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК

A

abėcė̃l|ė (2) алфавіт, азбука; **~inis** (1) алфавітны
abejaĩp *прысл.* двума спосабамі, дваяка
abejì абое
abejìngas (1) абыякавы
abejõnė (2) сумнеў
ãbejos *гл.* abejì
abejó|ti (~ja, ~jo) сумнявацца; **~tinas** (1) сумнеўны
abì̃(dvi) абедзве
abìpus абапал, з двух бакоў
abipùsis (2) двухбаковы
abitūrà (2) іспыт на атэстат сталасці
abù(du) абодва, абое
ãctas (2) воцат
ãčiū *выклічн.* дзякуй
ãdata (1) іголка
Ãdrijos jū́ra (1) Адрыятычнае мора
aeroúostas (1) аэрапорт
afroamerikiẽtis (2) афраамерыканец, цемнаскуры амерыканец
agrãstas (2) агрэст
aguonà (2) мак
aguõninis (1) макавы
agur̃k|as (2) агурок; **~inis** (1) агурковы
agurõtis (2) кабачок
áibė (1) мноства
áidas (4) рэха
aid|ė́ti (áidi, ~ė́jo) гучаць, чуцца
áikčio|ti (~ja, ~jo) енчыць
aikšt|ẽ (3) плошча, пляц; **~ẽlė** (2) пляцоўка, поле (*у спартыўных гульнях*); **~ýnas** (1) стадыён, спартыўны комплекс
aikštìngas (1) капрызны; наравісты
áimana (1) лямант; стогн, енк
aiman|úoti (~úoja, ~ãvo) лямантаваць; наракаць
aĩnis (2) нашчадак
Aĩrija (1) Ірландыя
aĩris (2) ірландзец
áisčiai (2) *мн. л.* балты
aistr|à (2, 4) жарсць, запал; **~ìngas** (1) жарсны, страсны; **~uõlis** (2) заўзятар
aišk|ė́|ti (~ja, ~jo) праясняцца, святлець; высвятляцца
áiškin|imas (1) (вы)тлумачэнне; **~ti** (~a, ~o) тлумачыць; **~tojas** (1) інтэрпрэтатар, тлумачальнік
áiškus (3) ясны; светлы
aitrùs (4) даўкі; гаркава-кіслы
áitvaras ($3^{а}$) дамавік; лятавец, папяровы змей
aižýti (aĩžo, aĩžė) лускаць; драбніць

àk, **ãk** *выклічн.* ах, о
ãkcininkas (1) акцыянер
akė́|ti (~ja, ~jo) баранаваць
akýlas (1) вачасты, пільны; назіральны; празорлівы
akìmirk|a (1), **~snis** (1) вокамгненне, імгненне
akìn|iai (3^b) *мн. л.* акуляры; **~iúotas** *дзеепрым.* чалавек у акулярах
ãkin|ti (~a, ~o) сляпіць, асляпляць
akìplėša (1) нахабнік
akìplotis (1) поле зроку
akìratis (1) далягляд, гарызонт; кругагляд
akìs (4) вока; вочка
ak|ýtas *дзеепрым.* сітаваты, губкаваты; **~ti** (~ìja, ~ìjo) рабіцца сітаватым, губкаватым
akìvaizd|a (1) прысутнасць, наяўнасць; **~ùs** (4) відавочны
akìvaras (1) вір; палонка; дрыгва
aklãvietė (1) безвыходнае становішча, тупік
ãkl|as (4) сляпы; **~inas** (3^b) шчыльны; суцэльны, глухі
aklùmas (2) слепата
akmen|ìngas (1), **~úotas** *дзеепрым.* камяністы; **~ìnis** (2) каменны; мураваны
akménslydis (1) кёрлінг (*спартыўная гульня*)
akmuõ (3^b) камень
aksomìnis (2) аксамітны
àkti (añka, ãko) слепнуць
akúotas (1) восць; рыбная костка
akùtė (2) вочка; ячэйка
ãlav|as (3^b) волава, *даўней* цына
alav|ìnis (2) алавяны, цыновы; **~úotas** *дзеепрым.* луджаны; пабяляны
algà (4) аклад
alìnė (2) піўная
ãlin|ti (~a, ~o) выпетрываць, рабіць бясплодным; вычэрпваць; пустошыць
alyvà (2) I аліва; II бэз
álk|anas (3^a) галодны; **~inti** (~ina, ~ino) марыць голадам
al̃kis (2) голад
al̃ksnis (2) вольха
alkū̃n|ė (1) локаць; калена, выгін; **~inis** (1) каленкаваты; локцевы
al̃p|ti (~sta, ~o) непрытомнець, млець
als|ãvimas (1) дыханне; **~úoti** (~úoja, ~ãvo) дыхаць
alsùs (4) утомны, цяжкі
alùs (4) піва
ãmat|as (3^b) рамяство
amatininñkas (2) рамеснік
amžė́|ti (~ja, ~jo) старэць
ámžin|as (3^a) вечны
amžinýbė (1) вечнасць
ámžininkas (1) *назоўн.* сучаснік; аднагодак

ámžius (1) узрост; век; стагоддзе
anà(s) тая, той
anądien днямі, нядаўна
anąkart тым разам, тады
angà (4) адтуліна; уваход
angl|iakasỹs (3^{4b}) шахцёр, гарняк; **~iãrūgštė** (1) вугальная кіслата; **~iãvandenilis** (1) вуглевадарод; **~iãvandenis** (1) вуглявод
anglìs (4) вугаль
anýta (1) свякруха, свякроўка
ankst|ì *прысл.* рана; **~ývas** (1), **~ùs** (4) ранні
añkštas (4) цесны, вузкі
ánkštis (1) струк; боб
anót *прыназ.* (+ *р. скл.*) паводле, згодна з
añt *прыназ.* (+ *р. скл.*) на
antaĩ *часц.* вось, от; вунь
añtakis (1) брыво
antgamtìnis (2), **añtgamtiškas** (1) звышнатуральны
añtis (2) I (за)пазуха
ántis (1) II качка
añtkainis (1) надбаўка (*у цане*)
añtkapis (1) надмагільны помнік
añtklodė (1) коўдра, плед
añtpetis (1) пагон, наплечнік
añtpuolis (1) напад, налёт, наезд
antrãdienis (1) аўторак
antra|eĩlis (2) другарадны
antraĩp інакш, іншым чынам
antra|kur̃sis (2) другакурснік; **~mẽtis** (2) другагоднік
añtras (4) другі
añtrašas (1) надпіс
añtraštė (1) назва, найменне; загаловак
antraštìnis (2) загалоўны, тытульны
añtrininkas (1) заступнік, намеснік; памочнік; дублёр, двайнік
añtspaudas (1) пячатка, штэмпель
antspaud|úoti (~úoja, ~ãvo) ставіць пячатку, штэмпеляваць; запячатваць
añtžmogis (1) звышчалавек
anū̃k|as (2) унук; **~ė** (2) унучка
anuõmet *прысл.* у той час
anuometìnis (2) тагачасны
apačià (3^{b}) ніз, спод
apatìnis (2) I ніжні; сподні; II сподняе
àpautas (2) абуты
ãpavas (3^{b}) абутак
apčiúopiamas (3^{a}) намацвальны, заўважны
apdailà (3^{b}) адстройванне; аздабленне
apdair|ùmas (2) перасцярога, абачлівасць; **~ùs** (4) абачлівы, асцярожны
ãpdaras (3^{b}) адзежа, убор, строй; вокладка

apdovan|ójimas (1) узнагарода; узнагароджванне; **~óti** (~ója, ~ójo) узнагароджваць; абдорваць

apdraũ|sti (~džia, àpdraudė) страхаваць

apeigìnis (2) абрадавы

ãpeigos (3^b) *мн. л.* абрады

apgailest|áuti (~áuja, ~ãvo) шкадаваць, мецць жаль

apgailė́|ti (apgaĩli, ~jo) аплакваць; быць засмучаным, шкадаваць

ãpgamas (3^b) радзімка

apgaudinė́|ti (~ja, ~jo) ашукваць; **~tojas** (1) ашуканец, круцель

apgáulė (1) ашуканства; зман; ілюзія, падман

apgavìk|as (2) *гл.* apgaudinė́tojas; **~iškas** (1) круцельскі, махлярскі

apgavỹstė (2) ашуканства, махлярства, круцельства

apgiñti (àpgina, apgýnė) абараняць, бараніць

apgyvéndin|ti (~a, ~o) пасяляцца; засяляць

apgraibomìs *прысл.* навобмацак; абы-як, нядбала

apgulà (3^b) аблога

apýbraiža (1) абрыс, контур; накід; нарыс

apibrėžìmas (2) азначэнне, дэфініцыя

apibrė́ž|tas (3) вызначаны; **~ti** (~ia, ~ė) вызначаць, акрэсліваць, даваць дэфініцыю

apibū̃din|imas (1) характарыстыка; **~ti** (~a, ~o) характарызаваць

apiẽ *прыназ.* (+ *він. скл.*) пра (*каго-н., што-н.*), аб (*кім-н., чым-н.*); вакол (*каго-н., чаго-н.*); каля (*пра нейкую колькасць*)

apýgarda (1) акруга

apygardìnis (2) акруговы

apýkaklė (1) каўнер(ык)

apýlanka (1) вакольны шлях

apýlinkė (1) наваколле, ваколіцы; акруга (*колішняя адміністрацыйная адзінка*)

apimtìs (3^b) аб'ём, ахоп

apynỹs (3^b) хмель

apýpietė (1) палудзенны час, апоўдне

apipirkė́jas (1) кансультант (*у закупах*)

apýrankė (1) бранзалет(ка)

apýsaka (1) аповесць

apýskaita (1) справаздача

apyskaitìnis (2) справаздачны

apýtaka (1) кругазварот; абарот (*напр.,* капіталу)

apývarta (1) абарачэнне

apkaltà (3^b) імпічмент

ãpkasas (3^b) акоп

ãpkepas (3^b) запяканка

apklausà (3^b) апытанне

apklõtas (2) покрыва; коўдра
apkrovà (3^b) нагрузка, цяжар; загружанасць
aplaid|ùmas (2) неахайнасць; нядбайнасць; **~ùs** (4) неахайны; нядбайны
ãplankalas (3^{4b}) вокладка; тэчка, папка; абгортка
ãplankas (3^b) тэчка, папка
apledė́jimas (1) абледзяненне, зледзяненне; галалёдзіца, вобліў
apliñk *прыназ.* (+ *він. скл.*) вакол; *прысл.* навокал, наўкола
aplink|à (3^b) асяроддзе; **~ýbė** (1) акалічнасць
apliñkinis (1) навакольны
aplinkósaug|a (1) ахова навакольнага асяроддзя; **~ininkas** (1) эколаг
apliñkraštis (1) цыркуляр, абежнік
apmataĩ (3^b) аснова (*тканіны*); агульны план
ãpmaudas (3^b) прыкрасць; злосць
apmaudùs (4) прыкры, непрыемны
apmók|amas (3^a) (а)платны
apmokė́tas *дзеепрым.* аплачаны
apmuĩtin|imas (1) абкладанне мытам; **~ti** (~a, ~o) абкладаць мытам
ãprašas (3^b), **aprãšymas** (1) вопіс, апісанне
apribó|ti (~ja, ~jo) абмяжоўваць
apsãkymas (1) апавяданне
apsaug|à (3^b) ахова; **~ìnis** (2) ахоўны
apsiaũstas (2) паліто; плашч
apsiginklãvimas (1) узбраенне
apsinuõd|yti (~ija, ~ijo) атручвацца
apsipirkinė́jimas (1) шопінг, хаджэнне па крамах на закупы
apsirikìmas (2) памылка
apsirìk|ti (apsiriñka, ~o) памыляцца
apsirū́pin|ti (~a, ~o) запасацца; забяспечваць сябе
apsivõgti (apsìvagia, apsìvogė) пракрадацца, пападацца на крадзяжах
apsižiūrė́|ti (apsižiū̃ri, ~jo) агледзецца; азірнуцца
apskaič|iúoti (~iúoja, ~iãvo) разлічваць, падлічваць, вылічваць
apskaità (3^b) улік
apskritaĩ *прысл.* наогул, агулам, увогуле
ãpskritas (3^b) круглы; цэлы, увесь
apskritìs (3^b) павет
apstùs (4) шчодры, багаты (*на што-н.*)
apsukr|uõlis (2) хітрун, пранырa; **~ùs** (4) пранырлівы

aptakùs (4) абцякальны
aptarìmas (2) абмеркаванне
aptar̃|ti (àptaria, ~ė) абмяркоўваць
aptarn|áuti (~áuja, ~ãvo) абслугоўваць; **~ãvimas** (1) абслугоўванне; абслуга
ãptvaras (3^b) загон
apúokas (1) пугач (*птушка*)
apval|ùmas (2) (з)акругленасць; ~**ùs** (4) круглы, (з)акруглены
apžiūr|à (3^b) агляд; дагляд; агледзіны; **~ḗti** (apžiū̃ri, ~ḗjo) аглядаць, рабіць агляд
apžvalg|à (3^b) агляд; **~iniñkas** (2) аглядальнік
ar̃ *часц.* ці; *злучн.* або, ці
arbà *злучн.* або, альбо, ці; *часц.* хіба
arbatà (2) гарбата, чай
arbãtinė (1) чайная, гарбатня
arbãtinis (1) чайны
arčiaũ *прысл.* (*выш. ст.*) бліжэй
ardýti (ar̃do, ar̃dė) бурыць, ламаць, разбіраць, зносіць
arkl|ìdė (2) стайня; **~ìnis** (2) конскі
arklỹs (3) конь
Árkties vandenýnas (1) Паўночны (Ледавіты) акіян
aršùs (4) зацяты
artḗ|ti (~ja, ~jo) набліжацца, блізіцца
árti (ãria, ãrė) араць
artì *прысл.* блізка
Artimíeji Rytaĩ (3) *мн. л.* Блізкі Усход
artójas (1) араты
ar̃timas (3^b) *назоўн.* сваяк, крэўны; *прым.* блізкі, недалёкі
ar̃tin|ti (~a, ~o) набліжаць, збліжаць
arùgula (1) ру́кала (*гароднiна*)
arúodas (1) засек, аруд
ąsà (4) вуха (*у збане і г. д.*), пятля
ãsilas (3^b) асёл
asiũ̃klis (2) хвошч
asménlazdė (1) кіёк для рабленння фота сэлфі
asmen|ýbė (1) асоба; **~ìnis** (2) асабісты, прыватны
asménsargis (1) целаахоўнік
asmen|uõtė (2) спражэнне; ~**úoti** (~úoja, ~ãvo) спрагаць
asmuõ (3^b) асоба, індывід
ąsõtis (2) збан
àš я
ãšaka (1) восць
ãšara (1) сляза; кропля
ašar|ìngas (1) слёзны, слязлівы; **~ìnis** (2) слёзны; ~**ótas** *дзеепрым.* заплаканы, слёзны; **~óti** (~oja, ~ojo) слязіцца
ašì|galis (1) полюс, канцавоссе; **~s** (4) вось (*напр.*, *зямная*)
ãštrin|ti (~a, ~o) вастрыць
aštrùs (4) востры

aštuntãdalis (1) восьмая частка, васьмушка
aštuñtas (4) восьмы
aštuonerì *зборн.*, **aštúonerios** *зборн.* восем, васьмёра
aštúoniasdešimt восемдзесят
aštuonì, aštúonios (3) восем, васьмёра
aštuoniólika васямнаццаць
ãšutas (3^b) конскі волас
atãskaita (1) справаздача
ãtbulas (3^b) скіраваны назад, адступны
atbul|ìnis (2) задні, зваротны; **~omìs** задам
ateitìs (3^b) будучыня, прышласць
ateĩvis (2) прыхадзень
atėjū̃nas (2) прыблуда
atėminỹs (3^{4b}) адымнік (*у матэматыцы*)
Atė́nai (1) *мн. л.* Афіны
atgail|à (3^b) жаль; раскайванне; **~áuti** (~áuja, ~ãvo) раскайвацца
atgal̃ назад
atidùs (4) уважлівы
atim̃ti (àtima, àtėmė) забіраць; адымаць
atimtìs (3^b) адыманне (*у матэматыцы*)
atitikmuõ (3^b) адпаведнік
atitiñkamas (3^b) адпаведны
atkakl|ùmas (2) упартасць; **~ùs** (4) упарты, настойлівы
atkarpà (3^b) адрэзак
ãtkirtis (1) адпор
atlaid|aĩ (3^b) *мн. л.* фэст (*у святыні*), адпуст; **~ùs** (4) паблажлівы
ãtlapas (3^b) *назоўн.* адварот, штрыфель; *прым.* адкрыты; разнасцежаны
atlydỹs (3^b) адліга
ãtliekos (3^b) *мн. л.* адкіды; рэшткі
atlýgin|imas (1) аплата, зарплата; **~ti** (~a, ~o) аплачваць; адплачваць; кампенсаваць
atlikė́jas (1) выканаўца
ãtlošas (3^b) спінка (*крэсла, фатэля*)
atmainà (3^b) змена, змяненне; адмена; гатунак, сорт, парода (*у біялогіі*); квадра
ãtmatos (3^b) *мн. л. гл.* ãtliekos
atminìmas (2) успамін; напамін, памятка; памяць
atmintìs (3^b) памяць
atmintùkas (2) флэшка, карта (дыск) памяці
atnaũjin|ti (~a, ~o) аднаўляць; абнаўляць, актуалізаваць
atógrąža (1) тропік, зваротнік
atogrąžìnis (2) трапічны
atókus (1) аддалены
atólas I (1) атава; II (2) атол
atómazga (1) развязанне; вырашэнне
atóslūgis (1) адліў, адплыў

(*марскі*)

atostog|áuti (~áuja, ~ãvo) быць у адпачынку, мець вакацыі; **~áutojas** (1) адпачывальнік, адпачынковец

atóstogos (1) *мн. л.* адпачынак; вакацыі

ãtpildas (3^b) помста, адплата

atpirkìmas (2) выкупленне; адкупленне

atplaišà (3^b) абломак, аскепак

atradìmas (2) адкрыццё; вынаходніцтва

atraižà (3^b) адрэзак, абрэзак

atramà (3^b) апора, падпорка; апірышча

atrank|à (3^b) адбор, селекцыя; **~ìnis** (2) адборачны, кваліфікацыйны

atsainùs (4) нядбалы

atsãkymas (1) адказ

atsakìngas (1) адказны

atsakýti (atsãko, atsãkė) адказваць; адмаўляць (*у чым-н.*)

atsak|omýbė (1) адказнасць; **~õvas** (2) адказчык; пазваны (*у суд*)

atsarg|à (3^b) запас(ы); асцярожнасць; засцярога; **~ìnis** (2) запасны; **~ùs** (4) асцярожны

atsi|liepìmas (2) водгук, меркаванне; рэцэнзія; **~mẽtėlis** (1) адступнік; **~metìmas** (2) адступніцтва; адмова; **~prãšymas** (1) прабачэнне; перапросіны; **~prašýti** (~prãšo, ~prãšė) прасіць прабачэння, перапрашацца; **~sakýti** (~sãko, ~sãkė) скасоўваць, ануляваць; скідваць (*напр.*, *інфармацыю*); **~šaukìmas** (2) адозва, зварот; **~tiktìnis** (2) выпадковы; **~tiktinaĩ** *прысл.* выпадкова; **~tikìmas** (2) выпадак; здарэнне; **~traukìmas** (2) адступленне, адыход; **~untìmas** (2) дасыланне; загрузка (*у кампутары*)

at|siųsti (~siuñčia, àtsiuntė) дасылаць; загружаць (*у кампутары*)

ãtskiras (3^b) (па)асобны

ãtspalvis (1) адценне

atspar|à (3^b) апора; апірышча; упор; **~ùmas** (2) трываласць; здольнасць да супраціву, адпорнасць; ~**ùs** (4) трывалы; адпорны; здольны да супраціву

ãtspaudas (3^b) адбітак

atspindỹs (3^b) водбліск; адлюстраванне, адбітак

atstõvas (2) прадстаўнік

atstov|áuti (~áuja, ~ãvo) аказваць; быць прадстаўніком (-цай), рэпрэзентаваць (*каго-н.*); **~ybė** (1) прадстаўніцтва

atstùmas (2) адлегласць

atsuktùvas (2) шрубнік, адвёртка

atšakà (3^b) адгалінаванне

atšalìmas (2) пахаладанне, ахалоджванне
atšálti (atšą̃la, atšãlo) халаднець
ãtšylis (1), **atšilìmas** (2) адліга; пацяпленне
atšìl|ti (atšỹla, ~o) цяплець; адтаваць
ãtšvaitas (3^b) рэфлектар
ãtvaizdas (3^b) выява; партрэт; адбітак
atvažiãvimas (1) прыезд, прыбыццё
atvaž|iúoti (~iúoja, ~iãvo) прыязджаць, прыбываць
ãtvejis (1) выпадак
ãtviras (3^b) адчынены; адкрыты; шчыры
ãtvirkščias (3^b), **atvirkštìnis** (2) адваротны
atvirùkas (2) паштоўка
atžalà (3^b) парастак, атожылак
ãtžvilgis (1) дачыненне, гледзішча, пункт погляду
áudeklas (3^a), **audìmas** (2), **audinỹs** (3^a) тканіна
audìmas (2) тканне; *гл. тс.* áudeklas
audrà (4) бура, навальніца
audrìngas (1) бурлівы, неспакойны
áudrin|ti (~a, ~o) хваляваць; узбуджаць
áugalas (3^a) расліна
augalìnis (2) раслінны
augìn|imas (1) апрацоўка, ураблянне; гадоўля; **~ti** (~a, ~o) апрацоўваць; гадаваць; выхоўваць; **~tojas** (1) той, хто займаецца гадаваннем (*напр., жывёлагадоўца*)
augmenijà (2) расліннасць, флора
áug|ti (~a, ~o) расці
aukà (4) ахвяраванне; даніна
áuklė (1) мамка, выхавацелька
áuklė|jimas (1) выхаванне, узгадаванне; **~ti** (~ja, ~jo) выхоўваць, гадаваць
áuklėtinis (1) выхаванец
aukó|ti (~ja, ~jo) прысвячаць; ахвяраваць
auksakalỹs (3^4a) ювелір, злотнік
áuks|as (3) золата; **~ìnis** (2) залаты; **~úotas** *дзеепрым.* пазалочаны
aukščiaũ *прысл.*, *выш. ст.* вышэй; паўзверх
aukščiáusias (1) *прым.*, *найвыш. ст.* найвышэйшы
aũkštas (2) *назоўн.* паверх; гарышча
áukšt|as (3) *прым.* высокі; **~inti** (~ina, ~ino) узвышаць, падвышаць; усхваляць
aũkštis (2) вышыня
aukštumà (3^a) узвышша; высь
aukštupỹs (3^a) вярхоўе (вышнявіна) ракі

aũkuras (3[b]) алтар, ахвярнік
ausìnės (2) *мн. л.* навушнікі
ausinùkas (2) партатыўны плэер (*з навушнікамі*)
ausìs (4) вуха
aũskaras (3[b]) завушніца
áusti (áudžia, áudė) ткаць
áustras (1) аўстрыец, аўстрыяк
áustrė (2) вустрыца
áušin|ti (~a, ~o) сцюдзіць, астуджаць
aušintùvas (2) ахаладжальнік, халадзільня
aušrà (4) золак, досвітак, зара
aušrìnė (2) мілавіца
áuš|ti (~ta, ~o) I астуджацца, ахалоджвацца
aũš|ti (~ta, ~o) II днець, світаць
aũ|ti (~̃na, ãvė) абуваць
ãvalynė (1) абутак
avė́|ti (ãvi, ~jo) насіць абутак
aviẽt|ė (2) маліны; **~inis** (1) малінавы
avilỹs (3[b]) вулей
ãvinas (3[b]) баран
avìs (4) авечка
avižìnis (2) аўсяны
ãvižos (3[b]) *мн. л.* авёс
ą́žuolas (3[a]) дуб
ąžuolýnas (1) дуброва, дубняк
ąžuolìnis (2) дубовы

B

bãdas (4) голад
bad|áuti (~áuja, ~ãvo) галадаваць
badãvimas (1) галадоўка, галадаванне
badýti (bãdo, bãdė) басці́, бадаць
baidýti (baĩdo, baĩdė) пужаць, палохаць
baigiamàsis *займ. прым.* апошні, завяршальны, канцавы; выпускны
baĩg|ti (~ia, ~ė) сканчваць, заканчваць
baigtìs (4) вынік
bail|ỹs (4) баязлівец, палахлівец; **~ùs** (4) баязлівы, палахлівы
báim|ė (1) страх, боязь; **~intis** (~inasi, ~inosi) баяцца
bais(en)ýbė (1) страшыдла; жах
baisùs (4) жахлівы, страшны
bajõras (2) баярын, шляхціч
bajorijà (2) шляхта, баяры
bajorỹstė (2) шляхоцтва; баярскі стан
balà (2) лужына
balandė̃liai (2) *мн. л.* галубцы
balañdis (2) I красавік; II голуб

bal̃dai (2) *мн. л.* мэбля
bãlinis I (2) балотны; II (1) бальны
bal̃kšvas (4) бялявы
bal̃nas (4) сядло
balsãdėžė (1) скрыня (урна) для галасавання
bal̃sas (4) голас
balsãvimas (1) галасаванне
bal̃sė (2) галосная літара
bal̃sis (2) галосны гук
bals|ìngas (1) галасісты; **~úoti** (~úoja, ~ãvo) галасаваць
balsúotojas (1) выбаршчык
bal̃talas (3[b]) бяліла
baltarusiakal̃bis (2) беларускамоўны
Baltarùsija (1) Беларусь
baltarùs|is (2) беларус; **~ė** беларуска
baltarùsiškas (1) беларускі
báltas (3) белы
bál|ti (bą̃la, bãlo) бялець; палатнець; **~tymas** (3[a]) бялок (*у розн. знач.*)
baltiniaĩ (3[a]) *мн. л.* бялізна; кашуля
Baltóji jū́ra (1) Белае мора
balt|ùmas (2) бель, белізна; **~úoti** (~úoja, ~ãvo) бялець
bámba (1) пупок
bandà (4) статак; табун
bandẽlė (2) булачка
bañdymas (1) спроба; дослед, эксперымент
bang|à (4) хваля; **~ìnis** (2) кіт (*жывёла*)
bañglent|ė (1) дошка для сёрфінгу; **~ininkas** (1) серфінгіст
bang|úotas *дзеепрым.* хвалісты; **~úoti** (~úoja, ~ãvo) хвалявацца
bãras I (4) участак, паласа; II (2) бар (*напр.,* піўны)
bar̃nis (2) лаянка, сварка
barstýti (bar̃sto, bar̃stė) сыпаць
bar̃ščiai (2) *мн. л.* боршч
barškḗ|ti (bárška, ~jo) стукаць; (*нягучна*) бразгаць; ляскаць; траскацець
bárti (bãra, bãrė) ганіць, лаяць, сварыцца (*на каго-н.*)
barzd|à (4) барада; **~ótas** *дзеепрым.* барадаты
bãsas (4) босы
baslỹs (4) кол, дрын
basùtės (2) *мн. л.* басаножкі
bast|ýtis (bãstosi, bãstėsi) валацужыць, бадзяжыць; **~ū̃nas** (2) валацуга, бадзяка, бадзяга
bãt|as (2) бот, паўбот; чаравік; **~ai** (2) *мн. л.* абутак; **~raištis** (1) матузок
batsiuvỹs (3[b]) шавец
batúotas *дзеепрым.* у ботах, у чаравіках
baũb|as (4) пудзіла; **~ti** (~ia, ~ė) рыкаць; мычаць, мыкаць

baud|à (4) штраф; ~**inỹs** (3^b) пенальці; штрафны кідок

baudž|iamàsis *займ. прым.* карны; крымінальны; **~iáuninkas** (1) прыгонны селянін

baũdžiava (1) прыгонніцтва

baudžiavìnis (2) прыгонны

baug|ìnti (~ìna, ~ìno) палохаць, пужаць; **~štùs** (4) баязлівы, пудкі; **~ùs** (4) палахлівы, баязлівы

bausmė̃ (4) ка́ра, пакаранне

baũ|sti (~džia, ~dė) караць

bažnýč|čia (1) касцёл, царква, храм, святыня; **~tinis** (1) касцельны, царкоўны; **~tkaimis** (1) касцельнае сяло

bè *прыназ.* (+ *р. скл.*) без; апроч; **~ penkių̃ minùčių dešimtà** без пяці дзесяць (дзясятая); **~ tõ** апроч таго

bẽbras (2) бабёр

bėd|óti (~ója, ~ójo) скардзіцца, плакацца, бедаваць

bėg|ìkas (2) бягун; **~ìmas** (2) бег

bė́gtakis (1) бегавы трэнажор

bė́g|ti (~a, ~o) бегчы; уцякаць; цячы; мінаць

beĩ *злучн.* і, ды

bejè дарэчы, між іншым

belaĩsvis (2) нявольнік, палонны

bél|sti (~džia, ~dė) стукаць, грукаць

bendraam̃žis (2) аднагодак, равеснік

bendrãbutis (1) інтэрнат

bendradarb|iáuti (~iáuja, ~iãvo) супрацоўнічаць

beñdra|s (4) *прым.* агульны; супольны, сумесны

bendratìs (3^b) інфінітыў

bendr|áuti (~áuja, ~ãvo) кантактаваць, камунікаваць, мець зносіны

bendrãvimas (1) стасункі, зносіны, камунікаванне, сумоўе

bendra|var̃dis (2) цёзка; **~žỹgis** (2) баявы паплечнік (таварыш)

bendrijà (2) супольнасць

beñdrininkas (1) саўдзельнік; супольнік

bendr|óvė (1) таварыства; кампанія; **~ùmas** (2) супольнасць; **~úomenė** (1) грамада; грамадства

beprãsmiškas (1) бессэнсоўны, недарэчны

beprõt|is (2) вар’ят, шаленец; **~iškas** (1) шалёны, вар’яцкі

berãštis (2) непісьменны

ber̃gždžias (4) бясплодны; бясплённы, марны

bérnas (3) малады чалавек, маладзён, хлопец

bern|áuti (~áuja, ~ãvo) быць кавалерам (халастым); парабкаваць

berniùkas (2) хлопчык, хлапец
beróds *пабочн. сл.* здаецца; відаць
beř̃ti (bẽria, bẽ̃rė) сыпаць; сеяць
béržas (3) бяроза
berž|ýnas (1) бярэзнік; **~ìnis** (2) бярозавы
bešãlis (2) бесстаронні
bèt *злучн.* але, аднак, а
bevéik *часц.* амаль
beždžiõnė (2) малпа
bičiuli|áuti (~áuja, ~ãvo) сябраваць
bičiùlis (2) сябар, прыяцель
bičiulỹstė (3) сяброўства
bičiùliškas (1) сяброўскі
bidònas (2) бітон
bijó|ti (bìjo, ~jo) баяцца
bylà (4) справа
bildesỹs (3^b) стук, грукат; галас
bildė́|ti (bìlda, ~jo) грукатаць
byrė́|ti (bỹra, ~jo), **bìrti** (bỹra, bỹro) сыпацца
biř̃žė (2) дзялянка
biržẽlis (2) чэрвень
bìtė (2) пчала
bitýnas (1) пчальнік, борць
bìtininkas (1) пчаляр
bitininkỹstė (2) пчалярства
bjaur|ė́ti (bjaũri, ~ė́jo) псавацца, горшаць; **~ýbė** (1) паскуднік; паскудства; **~ùmas** (2) брыдота; **~ùs** (4) брыдкі
blaiv|ė́ti (~ė́ja, ~ė́jo) праясняцца; цверазець
blaivùs (4) цвярозы
blãkė (2) блашчыца, клоп; «жучок» (*прылада для падслухоўвання*)
blakstíenos (1) *мн. л.* вейкі
blankùs (4) бледны; бляклы; мутнаваты; замглёны
blaškýti (blãško, blãškė) кідаць, шпурляць; ганяць
blauzdà (4) галёнка
bliáuti (bliáuna, blióvė) бляяць, бэкаць; раўці
blỹkšti (blỹkšta, blỹško) палатнець, бляднець
blyškùs (4) бледны; цьмяны
blìzgė (2) блешня
blizgė́|ti (blìzga, ~jo) блішчаць, зіхцець
blìzg|inti (~ina, ~ino) наводзіць бляск; адчышчаць
blizgùtis (2) блішчынка
blõgas (4) кепскі, дрэнны, благі; худы
blogýbė (1) зло, ліха
blõg|inti (~ina, ~ino) пагаршаць
blõgis (2) *гл.* blogýbė
blõkšti (blõškia, blõškė) малаціць
blusà (2) блыха
blužnìs (2) селязёнка
bób|a (1) баба; **~as** (2) кароткая жаночая фрызура (стрыжка); **~iškas** (1) бабскі

bòkseriai (1) *мн. л.* трусы-шорты, «баксёркі»

bókšt|as (1) вежа; **~inis** (1) вежавы

Bonà (2) Бон

botãgas (2) пуга; батог

braidýti (braĩdo, braĩdė), **bráidž|ioti** (~ioja, ~iojo) брысці

braĩžas (4) почырк; манера; стыль

braiž|ýba (1) чарчэнне, крэсленне, рысаванне

bráižyti (~o, ~ė) драпаць

braižýti (braĩžo, braĩžė) чарціць, крэсліць, рысаваць

brañčas (2) позні сняданак, ланч

brand|à (4) спеласць; сталасць; **~uolìnis** (2) ядзерны, ядравы; **~uolỹs** (3[a]) ядро; **~ùs** (4) спелы; сталы

brangenýbė (1) каштоўнасць; кляйнот

brangìn|ti (~a, ~o) цаніць, шанаваць

bráng|ti (~sta, ~sto) даражэць

brangùs (3) дарагі (*у розн. знач.*)

brastà (4) брод

brãškė (2) трускалка, трускаўка, клубніца (*адна ягада*)

brašk|ėti (brãška, ~ė́jo) трашчаць, траскатаць

braškýnas (1) плантацыя трускалак (клубніц)

braukýti (braũko, braũkė), **braũk|ti** (~ia, ~ė) перакрэсліваць, крэсліць; расціраць

bráunis (1) шакаладны торт

brė́kš|ti (~ta, brė́ško) днець, світаць; сутонець, змяркацца

bręs|ti (~ta, bréndo) даспяваць, налівацца

brėžinỹs (3[a]) чарцёж, рысунак

brė́žti (~ia, ~ė) драпаць; *гл.* braukýti

briaunà (4) руб, кант; броўка

bríedis (1) лось

briedžiùkas (2) I ласяня; II смаржок (*грыб*)

brì|sti (breñda, ~do) ісці ўброд

brỹzas (2) аполак (*сала*)

brìzgilas (3[b]) цуглі; вуздэчка

brolė́nas (1) пляменнік (*братаў сын*)

bról|ienė (1) нявестка, братавая; **~is** (1) брат; **~iškas** (1) братэрскі, братні

brùkalas (3[b]) спам (*у электроннай пошце*)

brùknė (2) брусніцы

brukn|iáuti (~iàuja, ~iãvo) збіраць брусніцы; **~ienė** (2) сочыва (канфітуры) з брусніц

brùkninis (2) брусьнічны

brūkšn|ẽlis (2) рысачка; дэфіс; **~ỹs** (4) штрых, рыса; працяжнік

brùkti (~a, ~o) пхаць, засоўваць

brúožas (1) рыса, характарыстыка

bruzdė́|jimas (1) хваляванне; валтузня; **~ti** (brùzda, ~jo) хвалявацца; валтузіцца, мітусіцца

buči|nỹs (3^b) пацалунак; **~úoti** (~úoja, ~ãvo) цалаваць

bū̃das (2) характар, спосаб; лад

bùdelis (1) кат

budė́|ti (bùdi, ~jo) дзяжурыць; не спаць; **~tojas** (1) дзяжурны, чарговы

būdìngas (1) характэрны, уласцівы

bùdin|ti (~a, ~o) будзіць

bū̃dvardis (1) прыметнік

bū̃gn|as (2) бубен, барабан; **~ininkas** (1) бубнач; барабаншчык

bū̃gn|yti (~ija, ~ijo) барабаніць, біць у бубен

buit|ìnis (2) побытавы; звычаёвы; **~ìs** (4) побыт

bùk|as (4) тупы; **~inti** (~ina, ~ino) тупіць, затупляць; **~ti** (buñka, bùko) тупець

bū́klė (1) стан

bùlius (2) бык

bùlvė (1) бульба; бульбіна

bulv|iẽnė (2) бульбяны суп, бульбеня; **~ìnis** (2) бульбяны

búomas (1) шлагбаум; лом; бум

búožė (1) галоўка; прыкла́д; кій

bùr|ė (2) ветразь

būrẽlis (2) групка; гурток

bū̃rininkas (1) камандзір узводу

bùrinis (1) ветразевы, з ветразем

būrỹs (4) узвод; аддзел, атрад

bur|iúoti (~iúoja, ~iãvo) плысці пад ветразем

bùrlaivis (1) карабель з ветразямі, вятружнік

burn|à (3) рот; **~óti** (~ója, ~ójo) моцна лаяць

burõkas (2) бурак

bùrtai (1) *мн. л.* кіданне жэрабя, жараб'ёўка, лёсаванне

bùrti (bùria, bū́rė) *гл.* buriúoti

bùrtininkas (1) чарадзей

bū́sena (1) стан (*псіхічны*)

bū́simas (3^a) будучы, прышлы

bū́stas (1) памяшканне

bù|sti (buñda, ~do) абуджацца

bùtas (2) кватэра

bùtelis (1) бутэлька, пляшка

bū́tent *прысл.* (а) менавіта

bū́ti (yrà [bū̃na, bū̃va] ẽsti, bùvo) быць, знаходзіцца; бываць

būtýbė (1) істота

bū́tinas (3^a) неабходны, абавязковы

būtinýbė (1) неабходнасць

būtìs (4) быццё, існаванне

bùtvagis (1) кватэрны злодзей

buveĩnė (2) месца жыхарства, кватараванне; месцазнаходжанне

bū̃vis (2) існаванне; стан

C

chèmija (1) хімія
chèminis (1) хімічны
cýp|auti (~áuja, ~ãvo), **cýpčio|ti** (~ja, ~jo) пішчаць, папіскваць
cỹp|ti (~ia, ~ė) віскатаць, вішчаць
citrinà (2) лімон, цытрына
citrìnmedis (1) лімоннае (цытрынавае) дрэва
cukraĩnė (2) кандытарская, цукерня
cùkraligė (1) дыябет, цукрыца
cukrãligininkas (1) хворы на цукрыцу (дыябет)
cukr|ãnendrė (1) цукровы трыснёг; **~ìngas** (1) цукрысты; **~úoti** (~úoja, ~ãvo) пасыпаць цукрам
cùkrinis (1) цукровы

Č

čáižyti (~o, ~ė) хвастаць, сцябаць
čèkas (2) чэх
Čèkija (1) Чэхія
čèkis (2) чэк
čel̃siai (2) *мн. л.* паўботы (*з прышытымі гумкамі*)
čepsė́|ti (čèpsi, ~jo) чвякаць; цмокаць
čer̃kšti (čer̃škia, čer̃škė) цвыркаць; вішчаць; рыпець
čérpė (1) дахоўка
čežùtės (2) *мн. л.* чэшкі (*лёгкі дзіцячы танцавальны абутак*)
čià *прысл.* тут; *займ.* гэта
čiãbuvis (1) тубылец
čiáud|ėti (~i, ~ėjo) чхаць
čiaudulỹs (3ᵃ) чханне
čiáup|as (3) кран; **~ti** (~ia, ~ė) сціскаць (*губы*)
čiauškė́|ti (čiáuška, ~jo) цёхкаць, шчабятаць; цвыркаць
čigõn|as (2) цыган; **~iškas** (1) цыганскі
čiobrẽlis (2) чабор, мацярдушка
čionýkštis (1) тутэйшы, мясцовы
čìrp|inti (~ina, ~ino), **čir̃p|ti** (~ia, ~ė) *гл.* čiauškė́ti
čirškė́|ti (čìrška, ~jo) стракатаць; шчабятаць
Čiùkčių jū́ra (1) Чукоцкае мора
čiulb|esỹs (3ᵇ) шчэбет; цвырканне; **~ė́ti** (čiùlba, ~ė́jo) шчабятаць

čiulpaĩ (4) *мн. л.* шпік, касцявы мозг

čiulpìnis (2) смактальная цукерка (*у т. л. на палачцы*)

čiul̃p|ti (~ia, ~ė) смактаць

čiulptùkas (2) дунда, сусла

por|úoti (~úoja, ~ãvo) спарваць

pó|rūšis (1) падвід; **~sakis** (1) выказванне; **~sėdis** (1) пасяджэнне; **~skyris** (1) пададдзел

põsmas (2) страфа; пасма (*ніткі*)

pó|stūmis (1) паварот; пералом; штуршок; **~sūnis** (1) пасынак

poškḗ|ti (póška, ~jo) грукаць; грымець

põteriai (1) *мн. л.* пацеры, модлы

põter|iauti (~iauja, ~iavo) прамаўляць пацеры

pó|traukis (1) *гл.* pólinkis; **~tvarkis** (1) распараджэнне;

~tvynis (1) паводка; патоп; **~veikis** (1) уплыў; уздзеянне; **~veržlė** (1) шайба (*у тэхніцы*); **~žymis** (1) прыкмета, рыса; **~žiūris** (1) пункт погляду; падыход

prabang|à (3^b) раскоша; **~ùs** (4) раскошны; пышны

pradalgẽ (3^b) пакос

prãdas (2) пачатак, аснова, падгрунце

pra|dieniuĩ праз дзень, кожныя два дні; **~dė́ti** (pràdeda, ~dė́jo) (рас)пачынаць; ініцыяваць; **~diniñkas** (2) ініцыятар; **~dìnis** (2) пачатковы; зыходны

pradmuõ (3^b) пачатак, аснова

pradž|ià (4) пачатак; **~iãmokslis** (1) лемантар; азбука (*кніга*)

pra|eitìs (3^b) мінулае, мінуўшчына; **~eĩvis** (2) мінак, прахожы; **~ėjìmas** (2) праход

pragaišt|ìngas (1) згубны; **~ìs** (3^b) згуба; пагібель

prãgar|as (3^b) пекла; **~iškas** (1) пякельны

prãgiedrulis (1) пробліск; прасвятленне

pragyvẽnimas (1) пражытак, пражыццё

prakalbà (3^b) прамова, выступ(ленне); *гл. тс.* pratarmẽ

prakilnýbė (1) шляхетнасць; эксцэленцыя (*у звароце*)

prãkuras (1) распал

pra|laimė́jimas (1) параза; пройгрыш; **~manýti** (prãmano, ~mãnė) выдумляць; **~mečiuĩ** праз год, кожныя два гады; **~mogà** (3^b) забава

pramog|áuti (~áuja, ~ãvo) бавіцца, мець забаву; **~ìnis** (2) забаўляльны

pramók|ti (~sta, ~o) падвучвацца

prãmon|ė (1) прамысловасць, індустрыя; **~ininkas** (1) прамысловец

pra|monìnis (2) прамысловы, індустрыяльны; **~muštgal̃vis** (2) вісус, прайдзісвет, шыбенік

prãnašas (3^b) прарок

pranaš|áuti (~áuja, ~ãvo) прарокаваць, прарочыць; **~ãvimas** (1), **~ỹstė** (2) прароцтва, прарокаванне

prãnašiškas (1) прарочы

pranaš|ùmas (2) перавага; **~ùs** (4) з перавагай, пераважны, дамінантны

praneš|ė́jas (1) дакладчык; дыктар; **~ìmas** (2) паведамленне; **~inė́ti** (~inė́ja, ~inė́jo), **pranèšti** (pràneša, pràneše) паведамляць; дакладаць

Prancūzijà (2) Францыя

Prãno Juõzapo Žẽmė (2) Зямля Франца Іосіфа
pranók|ti (~sta, ~o) апярэджваць; пераўзыходзіць
praplìkęs *дзеепрым.* лысы, аблыселы
prapùld|yti (~o, ~ė) губляць
pra|pùlti (~púola, ~púolė) прападаць; гінуць; **~radìmas** (2) страта; **~rajà** (3[b]) прорва, прадонне, бездань; **~ràsti** (~rañda, ~rãdo) губляць, страчваць;**~simãnymas** (1) выдумка, фікцыя
prasi|man|ýti (~mãno, ~mãnė) I выдумляць; II здабываць; набываць
prasm|ẽ (4) сэнс; **~ìngas** (1) сэнсоўны; асэнсаваны
prãstas (4) I просты; II кепскі, благі
prastė́|ti (~ja, ~jo) пагаршацца;
prãstin|ti (~a, ~o) спрашчаць; пагаршаць
prastúomenė (1) просты люд
pràsti (prañta, prãto) звыкацца
prastovà (3[b]) прастой
prãšymas (1) просьба; прашэнне
prašinė́|ti (~ja, ~jo) часта прасіць; упрошваць
praš|ýti (prãšo, prãšė) прасіць; **~ýtojas** (1) просьбіт; **~matnùs** (4) шыкоўны, цудоўны
pratarmẽ (3[b]) прадмова
prat|ýbos (1) *мн. л.* практычныя заняткі; **~ìmas** (2) практыкаванне
prãt|inti (~ina, ~ino) прывучаць; **~isas** (3[b]) працяглы
prausyklà (2) умывальня
prausĩklis (2) мыйны сродак (*для мыцця ў ванне*)
praũs|ti (~ia, ~ė) мыць
praust|ùvas (2), **~ùvė** (2) рукамыйнік, умывальнік; мядніца
pra|vaikštà (3[b]) прагул (*на працы*); **~vardẽ** (3) мянушка
pravardž|iúoti (~iúoja, ~iãvo) абзываць
pravartùs (4) прыдатны
praver̃|sti (~čia, pràvertė) прыдавацца
prãviras (3[b]) прачынены
pra|žangà (3[b]) фол (*у спартыўных гульнях*); **~žūtìngas** (1) *гл.* pragaištìngas; **~žūtìs** (3[b]) *гл.* pragaištìs
prẽkė (2) тавар
prek|iáuti (~iáuja, ~iãvo) гандляваць; **~iáutojas** (1) гандляр; **~iãvimas** (1) гандаль, гандляванне; **~ýba** (1) гандаль; **~ýbininkas** (1) гандляр, купец, камерсант
prẽkinis (1) гандлёвы
prekýʹ|metis (1) кірмаш; **~stalis** (1) прылавак; стойка; **~vietė** (1) рынак; базар

prė́skas (3) прэсны
pribuvė́ja (1) *гл.* priėmė́ja
prìderamas (3^{4b}) належны; дарэчны
pridėtìnis (2) дадатковы
pridùrm|ais, ~ui следам, утроп
priẽ *прыназ.* (+ *р. скл.*) пры; пад; да; у (*каго-н.*, *чаго-н.*)
príe|angis (1) ганак; перадпакой; **~augis** (1) прырост; **~auglis** (1) прыплод; *гл. тс.* príeaugis; **~balsė** (1) зычная літара; **~balsis** (1) зычны гук; **~blanda** (1) сутонне, прыцемкі; **~butis** (1) ганак; **~dainis** (1) рэфрэн, прыпеў; **~danga** (1) сховішча; прыкрыццё
priẽdas (2) дадатак; наддатак; залучнік, дададзены файл (*у электроннай пошце*)
príe|dėlis (1) дадатак (*у розн. знач.*); **~dermė** (1) абавязак; павіннасць; **~gaidė** (1) інтанацыя; **~glauda** (1) прытулак; **~globstis** (1) апека; *гл. тс.* príeglauda
prieĩnamas (3^b) даступны
priėjìmas (2) доступ; падыход
príe|kaba (1) прычэп; **~kabė** (1) зачэпка
priekab|iáuti (~iáuja, ~iãvo) чапляцца; **~ùs** (4) прыдзірлівы
príekaištas (1) папрок; дакор
priekaišt|áuti (~áuja, ~ãvo) дакараць, папракаць; **~ãvimas** (1) папрокі; **~ìngas** (1) з дакорам
príe|kalas (1) кавадла; **~kin** наперад; **~kinis** (1) пярэдні; **~kis** (1) перад; пярэдняя частка; **~laida** (1) перадумова; дапушчэнне; **~linksnis** (1) прыназоўнік; **~maiša** (1) дамешак, прымесь
priėmė́j|a (1) павітуха; акушэрка; **~as** (1) прымальнік, прыёмшчык
priemenẽ (3^a) перадпакой; сенцы
priemiestìnis (2) прыгарадны
príemiestis (1) прыгарад, прадмесце
priėmìmas (2) прыём, прыманне, атрыманне (*тавару*)
príe|moka (1) даплата; наддатак; **~molis** (1) суглінак; **~monė** (1) сродак; прылада; спосаб; **~plauka** (1) прыстань; **~puolis** (1) прыпадак; прыступ
prieraišùs (4) адданы, верны
príe|rašas (1) прыпіска; **~saika** (1) прысяга; **~sakas** (1) запавет, наказ; **~skonis** (1) прыправа; **~spauda** (1) прыгнёт; **~statas** (1) прыбудова; **~svoris** (1) прывага, прырост вагі

priẽš *прыназ.* (+*він. скл.*) супраць; перад; пад

prieš|akìnis (2) пярэдні; **~akỹs** (3[a]) *гл.* príekis

príeš|as (1) вораг; **~dėlis** (1) прыстаўка, прэфікс; **~gyna** (1) упартасць; непаслухмянасць

prieš|iáuti (~iáuja, ~iãvo) пярэчыць; супярэчыць; упарціцца; **~ýbė** (1) процілегласць

príeš|ingai насуперак, насупор; процi; **~ingas** (1) процілеглы; супярэчны

priešing|ýbė (1), **~ùmas** (2) процілегласць

príeš|ininkas (1) праціўнік; **~intis** (~inasi, ~inosi) працівіцца, супраціўляцца

príeširdis (1) прысэрцак, перадсердзе

príeš|istorė (1) першабытная гісторыя; **~iškas** (1) варожы

priešiškùmas (2) варожасць; варажнеча

príešlapis (1) фарзац

prieš|lėktùvinis (1) проціпаветраны, супрацьпаветраны; **~mirtìnis** (2) перадсмяротны

príeš|nuodis (1) проціяддзе, антыдот; **~okiais, ~okomis** урыўкамі, фрагментарна; **~piečiai** (1) *мн. л.* I час перад абедам; II ланч; **~pilis** (1) замчышча; **~pilnis** (1) маладзік; месяц, які расце

príeštara (1) супярэчнасць; пярэчанне

prieštar|áuti (~áuja, ~ãvo) (су)пярэчыць; **~ãvimas** (1) супярэчнасць; **~ìngas** (1) супярэчлівы

priešvalstýbinis (1) антыдзяржаўны

príe|taisas (1) прыбор; апарат; прылада; **~taras** (1) забабоны, прымхі

prietarìngas (1) забабонны, прымхлівы

príe|tema (1) *гл.* príeblanda; **~vadas** (1) порт (*у кампутары*); **~vaizdas** (1) наглядчык; **~varta** (1) гвалт; прымýс

prievart|áuti (~áuja, ~ãvo) гвалтаваць; гвалціць; **~ãvimas** (1) гвалтаўніцтва; вымантачванне; *гл. тс.* príevarta; **~ìnis** (2) прымусовы

príe|veiksmis (1) прыслоўе; **~volė** (1) абавязак; павіннасць; **~volininkas** (1) які мае абавязак

priežastìs (3[a]) прычына

príe|žiūra (1) нагляд; дагляд; **~žodis** (1) прымаўка

pri|gavìkas (2) ашуканец, махляр; **~gimtìs** (3[b]) прырода, натура; **~imamàsis** *займ. прым.* прыёмны; **~im̃tinas**

(3[b]) прымальны; **~juõstė** (2) хвартух; **~kaistùvis** (2) *гл.* kaistùvas; **~nókęs** *дзеепрым.* спелы; **~pratìmas** (2) звычка; **~segtùkas** (2) залучнік, дададзены файл (*у электроннай пошце*); **~sikėlìmas** (2) уваскрэсенне; адраджэнне; **~siminìmas** (2) згадка, успамін; **~siplãkėlis** (1) *гл.* padlaižỹs; **~tarìmas** (2) ухваленне; падтрымка; акампанемент; **~vãlomas** *дзеепрым.* абавязковы; **~valùmas** (2) неабходнасць; перавага, добрая якасць; **~valùs** (4) неабходны; **~važiãvimas** (1) пад'езд; **~verstìnis** (2) *гл.* prievartìnis; **~žiūrė́tojas** (1) *гл.* príevaizdas

prõ *прыназ.* (+*він. скл.*) цераз, праз; скрозь

pró|ga (1) нагода; **~perša** (1) I палонка; II прасвет; **~seniai** (1) *мн. л.* продкі; **~skyna** (1) прасека; **~švaistė** (1) прасвет; пробліск; **~tarpiais** часам, перыядычна; **~tarpis** (1) прамежак

prõtas (2) розум, клёк

prot|áuti (~áuja, ~ãvo) думаць, мець роздумы

prótėviai (1) *мн. л. гл.* próseniai

pro|tìngas (1) мудры; **~tingùmas** (2) мудрасць

prõtinis (1) разумовы, інтэлектуальны

prótrūkis (1) выбух

pruñkš|ti (~čia, ~tė) фыркаць

prùsin|ti (~a, ~o) развіваць, даваць асвету

prùs|ti (prūsta, ~o) развівацца

pū́dymas (1) папар

pū́d|yti (~o, ~ė) гнаіць

pūgà (4) завіруха; замець

puikýbė (1) I пыха, фанабэрыя; II дасканаласць, прыгажосць

puĩk|ti (~sta, ~o) I рабіцца ганарыстым; II рабіцца дасканалым

puikù цудоўна, выдатна

puik|úotis (~úojasi, ~ãvosi) выхваляцца; фарсіць; **~ùs** (4) I цудоўны, выдатны; II ганарысты

pũkas (4) пух

pūk|ìnis (2) пуховы; **~úotas** *дзеепрым.* пушысты; **~útis** (2) пухавік

puldinė́|ti (~ja, ~jo) пáдаць; нападáць

pū́liai (1) *мн. л.* гной (*у ране*)

pūlìngas (1) гнойны

pūl|inỹs (3[a]) гнайнік; **~iúoti** (~iúoja, ~iãvo) гнаіцца

pul̃k|as (4) полк; натоўп, тлум; зграя; **~ininkas** (1) палкоўнік

pulk|úoti (~úoja, ~ãvo) тоўпіцца; збірацца ў зграю

pùlti (púola, púolė) кідацца; наступаць; *гл. тс.* puldinė́ti

pum̃puras (3b) пупышка
púodas (1) гаршчок; рондаль
puod|ẽlis (2) гаршчэчак, гарнушак; рандэлак; **~ỹnė** (2) збанок, гарлачык (*пасудзіна*); **~ùkas** (2) філіжанка; куба(ча)к; *гл. тс.* puodẽlis
puõdžius (2) ганчар
púokštė (1) букет
puol|ė́jas (1) нападнік; **~ìmas** (2) наступ; напад; падзенне
púoselė|ti (~ja, ~jo) пеставаць
puoš|menà (3b) аздоба; упрыгажэнне; **~nùs** (4) аздобны; элегантны
puõš|ti (~ia, ~ė) аздабляць, упрыгожваць; строіць
puot|à (4) бяседа, застолле; баль; **~áuti** (~áuja, ~ãvo) баляваць
pup|à (2) боб; **~ẽlė** (2) фасоля; **~iẽnė** (2) бабовы суп
pur|énti (~ẽna, ~ẽno) рыхліць, разрыхляць; **~entùvas** (2) разрыхляльнік; **~íena** (1) лотаць
pur̃slai (2) *мн. л.* пырскі
pur̃kšti (pur̃škia, pur̃škė) пырскаць, абпырскваць
pur̃škalas (3b) абпырскавальнік, спрэй
pùrt|yti (~a, ~ė) трэсці; абтрасаць
purùs (4) пульхны; пушысты; сыпкі
pur̃v|as (4) гразь; **~inas** (3b) гразкі; багністы, забалочаны
purvýnas (1) гразь, бруд
pur̃vin|ti (~a, ~o) брудзіць, забруджваць
pùs|bernis (1) падлетак; хлопец-парабак; **~brolis** (1) стрыечны брат; **~dalyvis** (1) паўпрыметнік (*у літоўскай мове*); **~ė** (2) палова; палавін(к)а; бок; **~seserė** (1) стрыечная сястра, кузін(к)а
pusė́tinas (1) зносны, дапушчальны, сякі-такі
pusiáu напалову; на дзве часткі; **~jas** (1) I паясніца, талія; II экватар; **~svyra** (1) раўнавага; **~sviras** (1) ураўнаважаны; раўнаважны
pùs|inis (1) палавінны; палавіністы; **~karininkis** (1) падафіцэр, унтэр-афіцэр; **~kojinė** (1) шкарпэтка; **~lapis** (1) старонка, бачына
pūsl|ẽ (4) пухір; пузыр; **~ė́tas** *дзеепрым.* у пухірах
pùsmergė (1) дзяўчынка-падлетак, тынэйджарка
pusn|ýnas (1) замець, сумёты; **~ìs** (4) сумёт
pùs|padis (1) падносак, падшэўка; **~ryčiai** (1) *мн. л.* снеданак, снеданне
pùsryč|iauti (~iauja, ~iavo) снедаць

pùs|rytis (1) *гл.* pùsryčiai; **~rūsis** (1) сутарэнне
pū̃stas (4) надзьмуты; успушаны
pùstekinis (1) які бегае трушком
pù|sti (puñta, ~to) пухнуць, апухаць
pū̃|sti (pùčia, ~tė) дзьмуць; надзімаць; граць (*на духавым інструменце*)
pust|ỹklė (2) тачыла, брусок; асялок; **~ýti** (pùsta, pùstė) I замятаць, заносіць снегам; II вастрыць; мянташыць
puš|ýnas (1) хваёвы лес; сасняк; **~ìnis** (2) сасновы, хваёвы; **~ìs** (4) сасна, хвоя
put|à (2) пена; **~ẽsiai** (2) *мн. л.* мус (*напой з ягад*);**~óti** (~ója, ~ójo) пеніцца
pū́ti (pū̃va, pùvo) гніць
pùtinas (3[b]) каліна
putlùtė (2) поўная жанчына, паўнаватая дзяўчына
pùtpelė (1) перапёлка
putrà (4) поліўка; пойла (*для жывёлы*)
put|úoti (~úoja, ~ãvo) сапці, цяжка дыхаць, пыхцець
pùvenos (1) *мн. л.* перагной, гумус
puv|ẽsis (2), **~inỹs** (3[b]), **pū̃zras** (2) гніль; гнілізна; парахня

R

rãčius (2) каляснíк, стальмах
rad|ãvietė (1) месца знаходкі (*чаго-н.*); **~ýbos** (1) *мн. л.* узнагарода (*за знойдзенае*); **~inỹs** (3[b]) знойдзеная рэч
ragaĩšis (2) булка, белы хлеб
rãgana (1) вядзьмарка; чараўніца
ragan|áuti (~áuja, ~ãvo) займацца вядзьмарствам (чараўніцтвам)
ragãn|ė (2) павойнік (*расліна*); **~ius** (2) вядзьмар, чараўнік
raganõsis (2) насарог
rãgas (4) рог
rag|áuti (~áuja, ~ãvo) каштаваць (*на смак*); **~ẽlis** (2) ражок; слухаўка; **~uõlis** (2) рагалік; круасан; **~úotas** *дзеепрым.* рагаты; **~uõtis** (2) рагатая жывёліна
rãgin|ti (~a, ~o) заахвочваць; заклікаць, падганяць
ráibas (3) пярэсты, рабы; стракаты
ráičio|ti (~ja, ~jo) качаць, перакочваць
raidà (4) развіццё
raĩdė (2) літара

raidýnas (1) алфавіт, альфабэт
raĩdinis (1) літарны
raik|ỹklė (2) хлебарэзка; **~ìklis** (2) прылада для наразання (*напр.*, *мяса*), слайсер
raikýti (raĩko, raĩkė) рэзаць, кроіць
ráinas (3) стракаты; паласаты
rainẽlė (2) раёк (*у воку*)
raĩstas (2) дрыгва, забалочаная лясіна
ráišas (3) кульгавы
raišk|à (4) выраз; **~ìngas** (1) выразны
raiš|úoti (~úoja, ~ãvo) кульгаць
ráiškus (3) выразны; зразумелы
raĩ|štis (2) звязка (*у розн. знач.*); матузок; павязка; **~tas** (4) конны, верхавы; **~telis** (1), **~tininkas** (1) коннік, вершнік; кавалерыст
raĩtymas (1) завіўка
raitýti (raĩto, raĩtė) накручваць; падкручваць; абплятаць
raizgaĩ (4) *мн. л.* сілкі, сіло
raizg|inỹs (3) сляплецанне; **~ýti** (raĩzgo, raĩzgė) плесці; вязаць
raiž|ýba (1) рыцінаванне, мастацкая разьба, гравіраванне; **~inỹs** (3^b) гравюра; рыціна; медзярыт; дрэварыт; **~ýti** (ráižo, raĩžė) рэзаць, выразаць; гравіраваць; **~ýtojas** (1) рэзчык; гравёр
rakìn|ti (~a, ~o) I зачыняць на замок, замыкаць; II адмыкаць
rãktas (2) ключ (*у розн. знач.*)
raktãžolė (1) ключыкі; першацвет
raktìkaulis (1) ключыца, раменніца
ram|bùs (4) лянівы; запаволены; нязграбны; **~eñtas** (2) мыліца; **~ýbė** (1) мір, спакой; **~ìnti** (~ìna, ~ìno) супакойваць; суцяшаць
ramstis (2) падпор(к)а; апірышча
ramumà (3^b) ціша, зацішша; *гл. тс.* ramýbė
ramùnė (2) рамонак
ramunẽlė (2) (лекавы) рамонак
ramùs (4) спакойны, ціхі, лагодны
Ramùsis vandenýnas (1) *гл.* Didỹsis vandenýnas
rándas (3) шнар
rand|éti (~éja, ~éjo) I загойвацца; II быць у шнарах; **~úotas** *дзеепрым.* увесь у шнарах
rang|à (4) замова, заказ; падрад; **~ýti** (rángo, rañgė) скручваць, згортваць; **~õvas** (2) выканаўца замовы, падраднік
rankà (2) рука
rañk|darbis (1) рукадзелле, рукамяства; **~ena** (3^b) рука(в)ятка; ручка; клямка;

~ininkas (1) гандбаліст; **~inis** (1) гандбол

rankinùkas (2) жаночая сумачка

ránk|ioti (~ioja, ~iojo) збіраць

rankó|galis (1) манжэта; **~vė** (1) рукаў, рукаво

rañkpinigiai (1) *мн. л.* грашовы задатак

rankraštýnas (1) збор рукапісаў

rañk|raštis (1) рукапіс, манускрыпт; **~šluostis** (1) ручнік; **~tūris** (1) падлакотнік

ras|ótas *дзеепрым.* зарошаны; **~óti** (~ója, ~ójo) зарошвацца, пакрывацца расою

rąstas (2) бервяно

ràsti (rañda, rãdo) знаходзіць

rast|ìnis (2) знойдзены; **~inùkas** (2) знайдыш, падкідыш; *гл. тс.* pamestinùkas

rãšalas (3^b) чарніла, атрамант

raš|éiva (1) графаман, пісака; **~ýba** (1) правапіс; **~ìklis** (2) асадка, ручка; **~inéti** (~inéja, ~inéjo) папісваць; **~inỹs** (3^b) пісьмовая праца; сачыненне, твор; **~ýsena** (1) почырк; **~ýti** (rãšo, rãšė) пісаць; **~ýtojas** (1) пісьменнік; **~ytùvas** (2) запісвальная прылада, самапісец; **~kýti** (rãško, rãškė) ірваць; зрываць

rãš|omasis *займ. прым.* пісьмовы; пісчы; пісьмовая праца; **~tas** (2) пісьмо; грамата; твор, праца

raštijà (2) пісьменства, літаратура

rãštinė (1) канцылярыя

raštìngas (1) пісьменны

rãšt|ininkas (1) пісар, службовец канцылярыі; **~iškas** (1) пісьмовы

rašt|úotas *дзеепрым.* узорысты; гафтаваны; **~úoti** (~úoja, ~ãvo) гафтаваць

raštved|ýba (1) справаводства; **~ỹs** (3^b) пісьмавод, сакратар

rãt|ai (2) *мн. л.* павозка, драбіны, фурманка; **~as** (2) кола

ratẽlis (2) колца; калаўротак

rãtlankis (1) вобад; шына

raudà (4) плач

raũdė (2) чырванапёрка, краснапёр(к)а (*рыба*)

raudón|as (1) чырвоны

Raudonóji jū́ra (1) Чырвонае мора

raudon|úoti (~úoja, ~ãvo) чырванець

raudó|ti (~ja, ~jo) гучна плакаць, раўці

ráugas (3) рошчына

raugìn|ti (~a, ~o) квасіць, заквашваць; гарбаваць

ráug|ti (~ia, ~ė) саліць, рабіць засол; квасіць

raukýti (raũko, raũkė) зморшчваць

raukšl|ẽ (4) зморшчына; **~ḗtas** *дзеепрым.* зморшчаны; **~ḗtis** (~ḗjasi, ~ḗjosi) моршчыцца

raum|enìngas (1) мускулісты; **~uõ** (3^b) цягліца, мышца, мускул

raup|aĩ (4) *мн. л.* воспа; **~úotas** *дзеепрым.* воспаваты; **~saĩ** (4) *мн. л.* струпля, праказа; **~súotas** *дзеепрым.* струпляваты, пракажоны

raũs|ti I (~ia, ~ė) капáць

raũ|sti II (~sta, ~do) чырванець; **~svas** (4) чырванаваты

rausvḗ|ti (~ja, ~jo) ружавець; *гл. тс.* raũsti II

raũsvin|ti (~a, ~o) рабіць чырвоным

ráu|ti (~na, róvė) ірваць

ravḗ|ti (rãvi, ~jo) палоць

rãžas (4) розга

ražíena (1) пожня, іржышча

rąžýtis (rą̃žosi, rą̃žėsi) пацягвацца

reg|à (4) зрок; бачанне; **~ḗti** (rẽgi, ~ḗjo) бачыць; **~imýbė** (1) бачнасць, ілюзія; **~inỹs** (3^b) відовішча

rẽgzti (rẽzga, rẽzgė) плесці (*у розн. знач.*)

reĩkalas (3^b) справа; патрэба

reikal|áuti (~áuja, ~ãvo) патрабаваць, вымагаць; **~ìngas** (1) патрэбны, неабходны; **~ingùmas** (2) патрэбнасць

reik|ḗti (reĩkia, ~ḗjo) быць патрэбным; **~lùs** (4) патрабавальны; **~mẽ** (1) патрэба

reikšm|ẽ (4) значэнне; **~ìngas** (1) (шмат)значны; істотны

réikšti (réiškia, réiškė) I значыць, мець значэнне; II выказваць, абвяшчаць

reiškinỹs (3^a) праява; з’ява; выраз

rẽksmas (4) крык

rėksmìngas (1) крыклівы

rẽk|ti (~ia, ~ė) крычаць

rémai (1) *мн. л.* рам(к)а

rėmẽliai (2) *мн. л.* аправа; абрамленне

rémin|ti (~a, ~o) абрамляць

rem̃ti (rẽmia, rẽmė) падпіраць; падтрымліваць

rémuo (1) пякотка

renginỹs (3^b) імпрэза, мерапрыемства

reñg|ti (~ia, ~ė) рыхтаваць; апранаць

rẽplės (2) *мн. л.* абцугі; клешчы

rẽtas (4) рэдкі (*у розн. знач.*)

ret|enýbė (1) рэдкасць; рарытэт; **~ḗti** (~ḗja, ~ḗjo) радчэць, радзець

rẽtin|ti (~a, ~o) прарэджваць

rẽtis (2) сіта; рэшата

rẽtkarčiais рэдка, зрэдку, зрэдчас

rezginỹs (3^b) вязанне, пляценне; спляценне

rė́ž|ti (~ia, ~ė) рэзаць
rę̃ž|tis (~iasi, ~ėsi) пнуцца; напружвацца
rėžtùkas (2) шкларэз, алмаз
riaumó|ti (~ja, ~jo) рыкаць, мычаць
riáuš|ės (1) *мн. л.* беспарадкі, хваляванні; **~ininkas** (1) бунтаўнік
rib|à (4) мяжа; **~ìnis** (2) гранічны; **~ótas** *дзеепрым.* абмежаваны; **~óti** (~ója, ~ójo) абмяжоўваць; **~uliaĩ** (3[b]) *мн. л.* рабізна; зыб(анне)
ryčiaũ на ўсход, ва ўсходнім кірунку
rìda (4) прабег
rid|énti (~ẽna, ~ẽno) каціць; катаць
rid|ìkas (2) рэдзька; **~ikė̃lis** (2) радыска
riebal|aĩ (3[a]) *мн. л.* тлушчы; **~ìnis** (2) тлу́шчавы; **~úotas** *дзеепрым.* зашмальцаваны
riebė́|ti (~ja, ~jo) тлусцець, сыцець
ríebin|ti (~a, ~o) таўсцець
rieb|ókšlis (1) сальнік; **~ùs** (4) тлусты
riedė́|ti (riẽda, ~jo) каціцца
riẽdlentė (1) скейтборд
riẽdmuša (1) клюшка
riedùčiai (2) *мн. л.* ролікавыя канькі, ролікі
riedulỹs (3[b]) валун
riẽk|ti (~ia, ~ė) рэзаць, наразаць; араць
riestaĩnis (2) абаранак
riẽ|stas (4) загнуты ўгору; **~sti** (~čia, ~tė) выгінацца
riestìniai (2) *мн. л.* зразы
ríešas (3) запясце, прыдалонне
rieškùčios (2) *мн. л.* жменя
ríešutas (3[a]) арэх
riešut|áuti (~áuja, ~ãvo) збіраць арэхі; **~ýnas** (1) ляшчына, арэшнік; **~ìnis** (2) арэхавы
riẽtenos (1) *мн. л.* сварка
ríe|tis (~jasi, ~josi) сварыцца
rievẽ (4) гадавое кольца (*дрэва*)
rìkis (2) афіцэр (*у шахматах*)
rik|iúoti (~iúoja, ~iãvo) парадкаваць; строіць
rykl|ẽ (4) горла; глотка; **~ỹs** (4) акула
rìksmas (4) крык
rýkštė (1) розга
rìktas (2) *гл.* klaidà
rìktelė|ti (~ja, ~jo) крыкнуць
rim̃bas (4) пуга; бізун
rým|oti (~o, ~ojo) сядзець падпёршыся рукамі
rìmtas (4) паважны, сур'ёзны
rimtė́|ti (~ja, ~jo) рабіцца паважным, сур'ёзнець
rìm|ti (~sta, ~o) сціхаць; супакойвацца
rimtìs (4) спакой, цішыня
rink|à (2) рынак, базар; **~ė́jas** (1) збіральнік; выбаршчык;

~ìmai (2) *мн. л.* выбары; **~inỹs** (3^b) зборнік; збор; калекцыя
riñkliava (1) збор, мыта
rinkmenà (3^b) файл
riñk|ti (reñka, ~o) збіраць; выбіраць
rinktìn|ė (2) зборная каманда (*у спорце*); **~is** (2) выбраны; адборны
risčià I (4) *назоўн.* трушок, рысь (*спосаб верхавой язды*)
risčià II *прысл.* трушком, рыссю
rì|sti (~ta, ~to) *гл.* ridénti
ristū̃nas (2) рысак
rỹšininkas (1) сувязіст; сувязны
ryšỹs (4) сувязь (*у розн. знач.*); повязь; пас, рэмень
ryškė́|ti (~ja, ~jo) выяўляцца, праяўляцца
rỹškin|ti (~a, ~o) выяўляць; праяўляць
ryškùs (4) выразны; яскравы; зыркі
ryšulỹs (3^b) скрутак; хатуль
rýt *гл.* rytój
rytaĩ (3) *мн. л.* усход
rýtas (3) раніца, ранак
rìtė (2) шпуля; шпулька
rìteris (1) рыцар
riteriškùmas (2) рыцарства
rýti (rỹja, rìjo) глытаць
ryt|iẽtiškas (1) усходні; **~ìnis** (2) ранішні
ritinỹs (3^b) скрутак; рулон; валец
rìtin|ti (~a, ~o) *гл.* ridénti
ryt|ỹs (4) усходні вецер; **~metỹs** (3^a) раніца, ранішні час; **~ój** заўтра
rìtulininkas (1): **lẽdo ~** хакеіст
ritulỹs (3^b) (хакейная) шайба; **lẽdo ~** хакей з шайбай
rỹžiai (2) *мн. л.* рыс
rỹžtas (2) рашучасць
ryžtìngas (1) рашучы
rýž|tis (~asi, ~osi) наважвацца, адважвацца
rod|ỹklė (2) указальнік; стрэлка; **~ìklis** (2) I паказчык, паказнік; II дышаль
ród|yti (~o, ~ė) паказваць; указваць
rõgės (2) *мн. л.* сан(к)і
rõjus (2) рай
Romà (2) Рым
ròmas (2) цыган
romė́n|as (1) рымлянін; **~iškas** (1) рымскі
romùs (4) ціхамірны, рахманы, ціхі
róp|ė (1) рэпа; **~inė** (1) графін
rop|liaĩ (4) *мн. л.* паўзуны, рэптыліі; **~óti** (~ója, ~ójo) поўзаць
rū̃b|as (2) адзенне, убор, вопратка; **~inė** (1) гардэроб, распранальня; **~ininkas** (1) гардэробшчык

rùdas (4) буры; карычневы; кары (*пра вочы*)
ruden|ė́ti (~ė́ja, ~ė́jo) брацца на восень; **~ìnis** (2) восеньскі, асенні; **~ióp** пад восень
rūdýnas (1) руднік, капальня руды
rū̃dys (4) *мн. л.* іржа
rūd|ýti (~ìja, ~ìjo) іржавець
rùdmėsė (1) рыж(ык)
rud|úoti (~úoja, ~ãvo) рудзець, рабіцца бурым
ruduõ (3^b) восень
rùgiagėlė (1) валошка, васілёк
rug|iaĩ (4) *мн. л.* жыта, жыты; **~iapjū́tė** (1) збор жыта, жніво; **~íena** (1) іржышча; **~ìnis** (2) жытні; **~ỹs** (4) жыта; **~pjū́tis** (1) жнівень; **~sė́jis** (1) верасень
rūgšt|ỹnė (2) шчаўе; **~ìnis** (2) кіслы
rū́gštin|ti (~a, ~o) рабіць кіслым
rūgštìs (3) кіслата; кісліня
rūgštùs (3) *гл.* rūgštìnis
rū́g|ti (~sta, ~o) рабіцца кіслым, кіснуць, скісаць
rujà (4) зграя
rūkalaĩ (3^b) *мн. л.* тытунёвыя вырабы
rū̃kas (4) імгла
rūkyklà (2) вяндлярня
rū̃kymas (1) вэнджанне; курэнне
rūk|ýtas *дзеепрым.* вэнджаны
rūkýti (rū̃ko, rū̃kė) I вэндзіць; II курыць, паліць
rū̃k|omasis *займ. прым.* курыльня; **~ti** (~sta, ~o) дыміць
rū́m|ai (1) *мн. л.* палац; палаты; **~ininkas** (1) прыдворны
rungt|ỹnės (2) *мн. л.* спаборніцтва; матч
rungtyn|iáuti (~iáuja, ~iãvo) спаборнічаць, супернічаць
rùng|tis (~iasi, ~ėsi) змагацца
rungtìs (3) від спорту
ruñkelis (1) бурак
rúonis (1) цюлень
ruoš|à (3) прыборка; **~inỹs** (3^b) паўфабрыкат
ruõš|ti (~ia, ~ė) рыхтаваць; прыбіраць
rúožas (1) палоса; участак
rūpestìngas (1) клапатлівы; дбайны
rū̃pestis (1) клопат; заклапочанасць
rūpė́|ti (rū̃pi, ~jo) турбаваць
rùpūžė (1) рапуха
rus|énti (~ẽna, ~ẽno) тлець; ліпець; **~ė́ti** (~ė́ja, ~ė́jo) русіфікавацца
rùsin|ti (~a, ~o) русіфікаваць
rūsỹs (4) падвал, сутарэнне
rū́st|auti (~auja, ~avo) злавацць
rūst|ėti (~ė́ja, ~ė́jo) рабіцца злосным, раз’юшвацца; **~ýbė** (1) гнеў

rū́stin|ti (~a, ~o) гнявіць
rūstùmas (2) *гл.* rūstýbė
rūstùs (3) суровы; злосны
rùsvas (4) буры
rū́š|inis (1) гатункавы; відавы; **~is** (1) гатунак; сорт; від; род (*войскаў*)
rūš|iúoti (~iúoja, ~iãvo) сартаваць
rū́škanas (3ª) пахмурны; змрочны
rutul|ìnis (2) шаравы; шарыкавы; **~ỹs** (3ᵇ) шар; ядро (*спартыўнае*)
rùtuliškas (1) шарападобны, кулепадобны

S

sag|à (4) гузік; **~stýti** (sãgsto, sãgstė) зашпільваць; **~tìs** (4) зашпіл(ь)ка; спражка
saĩkas (4) мера
saikìngas (1) памяркоўны
saĩtas (2) повязь
saitýnas (1) Сеціва, глабальная сетка
są́jūdis (1) рух
są́jung|a (1) саюз; хаўрус; **~ininkas** (1) саюзнік; хаўруснік
sąjungìnis (2) саюзніцкі; хаўрусны
sakaĩ (4) *мн. л.* смала, жывіца
Sakartvèlas (2) Грузія
sak|artveliẽtis (2) грузін; **~artvèliškas** (1) грузінскі; **~ýkim** *ув. сл*. дапусцім; **~yklà** (2) амбон; **~inỹs** (3ᵇ) сказ (*у сінтаксісе*); **~ýti** (sãko, sãkė) казаць, мовіць
sãkomasis *займ. прым*. вусны
salà (4) выспа, востраў
sald|aĩnis (2) цукерка; **~ìklis** (2) падсалоджвальнік; **~ìnis** (2) салодкі
sáldin|ti (~a, ~o) саладзіць
saL̃dis (2) слодыч
sald|umýnai (1) *мн. л.* салодкія ласункі; **~ùs** (3) *гл.* saldìnis
saliẽrai (2) *мн. л.* сельдэрэй, сялера
są́lyga (1) умова, варунак
sąlygìnis (2) умоўны
są́lyg|iškas (1) згодны з умовай; **~otas** *дзеепрым.* абумоўлены; **~oti** (~oja, ~ojo) абумоўліваць
salýnas (1) архіпелаг
są́lytis (1) кантакт
salõtos (2) *мн. л.* салата (*страва*)
sãmana (1) мох
saman|ótas *дзеепрым.* за(і)мшэлы, абамшэлы, зарослы мохам; **~óti** (~ója, ~ójo) зарастаць імхом

są́mata (1) каштарыс
sám|brėškis (1) сутонне; змрок; **~brūzdis** (1) мітусня; **~būris** (1) зборня; зборышча; збор; аб'яднанне, таварыства; **~būvis** (1) суіснаванне
samd|à (4) наймы, найманне; **~iniñkas** (2), **~inỹs** (3[b]) найміт; наёмны працаўнік; **~ýti** (sam̃do, sam̃dė) наймаць; прымаць на працу
są́myšis (1) пярэпалах
sąmojìngas (1) дасціпны
są́|mojis (1) дасціпнасць; дасціп; **~mokslas** (1) змова, замах; **~mokslininkas** (1) змоўнік
są́monė (1) свядомасць
sąmonìngas (1) свядомы
sámprata (1) канцэпцыя; разуменне
samprot|áuti (~áuja, ~ãvo) разважаць
sámtis (1) чарпак; коўш
sąnarỹs (3[a]) сустаў
są́n|ašos (1) *мн. л.* нанос; замець; **~audos** (1) *мн. л.* выдаткі
sándara (1) будова; структура
sandarìklis (2) герметык; ушчыльняльнік
sandarùs (4) шчыльны; герметычны
sándauga (1) здабытак (*у матэматыцы*)
sándėl|ininkas (1) кладаўшчык; **~is** (1) кладоўка, склад, памяшканне пад склад
sandėl|iúoti (~iúoja, ~iãvo) складава́ць
sán|dėris (1) трансакцыя; гешэфт; **~drauga** (1) супольнасць; **~dūra** (1) сутык; **~grąža** (1) зваротная часціца; **~grūda** (1) затор
sangul|iáuti (~iáuja, ~iãvo) чужаложыць, здраджваць у шлюбе
sán|kaba (1) скаба́; счэп; счапленне; **~kasa** (1) насып (*чыгуначны*); **~kaupa** (1) накапленне; ашчаджэнне; **~kryža** (1) скрыжаванне; **~taika** (1) згода; **~taupos** (1) *мн. л.* ашчаджэнні
sántyk|iauti (~iauja, ~iavo) мець зносіны (*у розн. знач.*); суадносіцца
santykìnis (2) адносны
sán|tykis (1) стасункі; адносіны; **~trauka** (1) зводка; рэзюмэ; **~trumpa** (1) скарот; **~tuoka** (1) шлюб
san|tuokìnis (2) шлюбны; **~tūrùs** (4) стрыманы
sántvarka (1) лад; парадак; уладкаванне
sãpnas (4) сон
sapn|úoti (~úoja, ~ãvo) сніць
są́|rama (1) перамычка;

~ranga (1) будова, структура; **~rašas** (3[a]) спіс; пералік
sárgas (3) вартаўнік
sarg|ýba (1) варта; **~ýbinis** (1) вартавы; каравульны
sárgis (1) прэзерватыў
sargùs (4) пільны
są́ryšis (1) (узаема)сувязь
sarmatà (2) сорам
są́|saga (1) зáпінка; скабá (*для стэплера*); **~saja** (1) I повязь; сувязь; II інтэрфэйс; **~siauris** (1) пратока; цясніна; **~siuvinis** (1) сшытак
są́skait|a (1) рахунак; **~ininkas** (1) рахункавод, бухгалтар
są́|skambis (1) сугучча; **~skrydis** (1) злёт, сход; **~slavos** (1) *мн. л.* смецце; **~smauka** (1) перашыек; **~spietis** (1) флэшмоб; **~statas** (1) склад; размяшчэнне; **~švelnis** (1) эўфемізм
sáu *займ.* сабе (*дав. скл.*)
saugà (4) бяспека; ахова
saũgas (4) паўабаронца
saug|yklà (2) схоў, сховішча; **~ìklis** (2) засцерагальнік
sáugo|ti (~ja, ~jo) сцерагчы, берагчы; захоўваць; пільнаваць, вартаваць
saugùmas (2) *гл.* saugà
sáu|ja (1) жменя; **~lė** (1) сонца
saulė́|grąža (1) сланечнік; **~lydis** (1) заход сонца; **~tas** *дзеепрым.* сонечны
saulė́tekis (1) узыход сонца
sausaĩnis (2) сухар; печыва да гарбаты
saũs|akimšas (3[4b]) перапоўнены; **~as** (4) сухі
sausė́|ti (~ja, ~jo) сохнуць; высыхаць
saũs|gyslė (1) сухажылле, шчапа; **~inti** (~ina, ~ino) высушваць; меліяраваць; **~is** (2) студзень; **~kelis** (1) сухапутны шлях; **~kelnės** (1) *мн. л.* падгузак, падгузнік; **~medis** (1) сухадрэвіна; **~metis** (1) сухі сезон
saus|rà (4) суш, сухмень, засуха; **~umà** (3[b]) мацярык, суша
savadar̃bis (2) самаробны
są́vadas (1) звод; кодэкс
sąvad|áutoja (1) зводніца; **~áuti** (~áuja, ~ãvo) зводзіць, займацца зводніцтвам; **~ãvimas** (1) зводніцтва
sav|aeĩgis (2) самаходны; **~áime** само сабою; **~aimìngas** (1), **~áiminis** (1) самаадвольны; **~aĩp** па-свойму, на свой капыл
saváit|ė (1) тыдзень; **~inis** (1) тыднёвы; **~galis** (1) канец тыдня, уікэнд; **~raštis** (1) (што)тыднёвік
sava|mõkslis (2) самавук; **~naũdis** (2) сябелюбны чалавек, эгаіст

savanoriãvimas (1) валанцёрства

savanõr|is (2) (добра)ахвотнік, валанцёр; **~iškas** (1) (добра) ахвотны, добраахвотніцкі; валанцёрскі

savarañkiškas (1) самастойны; уласнаручны

są́varta (1) купа; куча; звалка

sąvartýnas (1) звалка, сметніца; злом

sąvaržė̃lės (2) *мн. л.* сашчэпкі

sãvas (4) свой, уласны

savavaIdis (2) самакіроўны, аўтаномны

savaval|iáuti (~iáuja, ~iãvo) самаволіць; сваволіць; **~iáutojas** (1) самавольнік; **~iãvimas** (1) самавольства

savavãliškas (1) самавольны

savè *займ*. сябе (*він. скл*.)

są́veika (1) супрац(оўніцтв)а; узаемадзеянне

savę̃s *займ*. сябе (*р. скл.*)

savýbė (1) рыса, уласцівасць, якасць

savyjè *займ*. сабе (*м. скл*.)

savì|gyna (1) самаабарона, самаахова; **~kaina** (1) сабекошт; **~meilė** (1) самалюбства; **~meilis** (1) самалюбны

savimì *займ*. сабой, сабою (*тв. скл*.)

saviniñkas (2) уласнік; гаспадар

sãvin|tis (~asi, ~osi) прысвойваць, прысабечваць

sãviškas (1) *гл.* savótiškas

savìškis (2) свой; родны

sãvitas (3ᵇ) арыгінальны; самабытны

savìvartis (1) самазвал

sàvo *займ*. сябе (*р. скл.*)

są́voka (1) паняцце, панятак

sav|ótiškas (1) своеасаблівы; **~ùmas** (2) уласцівасць, асаблівасць

sąžalýnas (1) густы зараснік

są́žinė (1) сумленне

sąžinìngas (1) сумленны

sėdỹnė (2) сядзенне

sė́dmenys (3ᵃ) *мн. л.*, **sėdmuõ** (3ᵇ) задніца, галы, гузно

sẽgė (2) *гл.* sagtìs

segìklis (2) стэплер, паперасшывальнік

segió|ti (~ja, ~jo), **sègti** (sẽga, sẽgė) зашпільваць; прышпільваць; сашчапляць

segtù|kas (2) шпілька; **~vas** (2) сашчэпка

seikė́|ti (~ja, ~jo) мераць; адмяраць

séilė (1), **~s** (1) *мн. л.* сліна

seilė́|tas *дзеепрым.* слінявы, у сліне; **~ti** (~ja, ~jo) слініцца

séilin|ti (~a, ~o) слініць

seilinùkas (2) сліняўчык, дзіцячы нагруднік

sėj|à (4) сяўба; **~ė́jas** (1) сейбіт;

~inùkas (2) сеянец; **~ómaina** (1) севазварот
sė́kla (1) насенне
sėklìdė (2) семяннік
sė́klinis (1) насенны
seklé|ti (~ja, ~jo) плытчэць, мяльчэць
sekl|ỹs (4) сысковец, сышчык, дэтэктыў; **~umà** (3^b) плыткасць, мелізна; **~ùs** (4) плыткі
sekm|ãdienis (1) нядзеля; **~ẽ** (4) поспех; удача, шчасце; **~ìngas** (2) паспяховы; удалы
Sekmìnės (2) *мн. л.* Сёмуха, Тройца
sèkti I (sẽka, sẽkė) сачыць; назіраць; ісці ўтроп
sèk|ti II (señka, sẽko) спадаць, убываць (*пра ваду*); меншаць; горшаць (*пра здароўе*); наследаваць, пераймаць; **~tinas** (3^b) варты пераймання; **~tis** (sẽkasi, sẽkėsi) ладзіцца, атрымоўвацца, мець поспех
sė́lenos (1) *мн. л.* вотруб’е
sẽlin|ti (~a, ~o) падкрадацца, падбірацца крадком
sė́menys (1) *мн. л.* ільняное семя, ільняное насенне
sémti (sẽmia, sė́mė) I чарпаць; II напаўняць
semtùvas (2) чарпак
senãmiestis (1) старое места, стары горад
sènas (4) стары; састарэлы
senatìs (3^b) тэрмін даўнасці
senãt|vė (2) старасць; **~viškas** (1) старэчы
sén|bernis (1) стары кавалер; **~buvis** (1) даўні жыхар, старажыл
séndin|ti (~a, ~o) рабіць старым
senẽl|ė (2) старая кабета, бабуля
senė́|ti (~ja, ~jo) старэць, старыцца
sẽn|iai даўно; **~is** (2) стары чалавек
sen|iū̃nas (2) солтыс, стараста; **~iūnijà** (2), **~iūnỹstė** (2) староства; **~ývas** (1) пажылы
sén|kapiai (1) *мн. л.* старыя могілкі; **~mergė** (1) старая панна
senõl|iai (2) *мн. л.* дзяды
senóv|ė (1) старажытнасць; **~inis** (1), **~iškas** (1) старажытны
sén|ti (~sta, sẽno) ялчэць; *гл. тс.* senė́ti; **~tikis** (1) старавер; **~vagė** (1) старыца, старарэчча
septynerì, septýn|erios (3^a) сямёра; **~etas** (1) сем; сямёрка
septynì, septýn|ios (3) сем; **~iasdešimt** семдзесят
septyniólika (1) сямнаццаць
septiñtas (4) сёмы

serbeñtas (2) парэчкі
serbent|áuti (~áuja, ~ãvo) збіраць парэчкі
serbeñtinis (1) парэчкавы
sẽsė (2) *гл.* sesuõ
seserė́|čia (1) пляменніца (*сестрына дачка*); **~nas** (1) пляменнік (*сын сястры*)
sėslùs (4) аселы
sė́|sti (~da, ~do) сядаць
sesuõ (3^b) сястра
sėtinỹs (3^a) бручка
siaũbas (4) жах
siaubìngas (1) жахлівы
siaũb|ti (~ia, ~ė) пустошыць, руйнаваць
siaurãpjūklis (1) лобзік
siaũras (4) вузкі
siaurė́|ti (~ja, ~jo) вузець, звужацца
siaũrin|ti (~a, ~o) звужаць
sidãbras (2) срэбра
sidabrìnis (2) срэб(ра)ны
siekìmas (2), **siẽkis** (2) імкненне
síek|ti (~ia, ~ė) дасягаць; імкнуцца
síel|a (1) душа; **~ininkas** (1) плытагон; **~is** (1) плыт; **~otis** (~ojasi, ~ojosi) турбавацца, непакоіцца; **~vartas** (1) смутак, скруха; **~vartáuti** (~vartáuja, ~vartãvo) засмучацца
síen|a (1) сцяна; мяжа; **~inis** (1) (на)сценны
sienójas (1) бервяно
sierìnis (2) серны
síe|tas (1) сіта; **~ti** (~ja, ~jo) звязваць
siet|ýnas (1) I Стажары, Сіта (*сузор'е*); II жырандоля; люстра, свяцільня; **~uvà** (3^b) глыбіня; вір
sijõnas (2) спадніца
sijonúota *дзеепрым.* у спадніцы
sijó|ti (~ja, ~jo) прасейваць
sỹkis (2) раз
sil̃k|ė (2) селядзец; **~inis** (1) селядцовы
sil̃pnas (4) слабы
silpn|ė́ti (~ė́ja, ~ė́jo) слабець; **~ýbė** (1), **~ùmas** (2) слабіна, слабасць
sil̃pnin|ti (~a, ~o) аслабляць
sil̃p|ti (~sta, ~o) *гл.* silpnė́ti
sirgãlius (2) заўзятар (*спорту*)
sir̃g|ti (ser̃ga, ~o) хварэць
sirgul|iúoti (~iúoja, ~iãvo) прыхворваць
sir̃p|ti (~sta, ~o) спець, даспяваць (*напр., пра ягады*)
siūb|úoti (~úoja, ~ãvo) калыхаць; гойдацца, калыхацца
siū́las (1) нітка
siūlẽ (4) шво
siūlė́|ti (~ja, ~jo) падшываць
siū́l|yti (~o, ~ė) прапаноўваць
siùnd|yti (~o, ~ė) цкаваць; нацкоўваць

siuntà (4), **siuntin|ỹs** (3^b^) пасылка; **~ė́ti** (~ė́ja, ~ė́jo) пасылаць, адпраўляць

siùrbčio|ti (~ja, ~jo) пасёрбваць

siurb|ėlẽ (3^b^) п’яўка; **~lìnė** (2) водапампавальня; **~lìnis** (2) помпавы; **~lỹs** (4) помпа

siùrbsnis (1) глыток

siur̃b|ti (~ia, ~ė) смактаць; высмоктваць, выпампоўваць

siù|sti (siuñta, ~to) раз’юшвацца, шалець

sių̃sti (siūñčia, siuñtė) *гл.* siuntinė́ti

siųstùvas (2) перадатчык

siū́ti (siùva, siùvo) шыць

siùtin|ti (~a, ~o) раз’юшваць

siuv|amàsis *займ. прым.* кравецкі; **~ė́jas** (1) кравец; **~yklà** (2) кравецкая майстэрня; швейная фабрыка

siuvin|ė́ti (~ė́ja, ~ė́jo) вышываць; **~ỹs** (3^b^) шытво; вышыўка

skaič|iuõklė (2) калькулятар; **~iúoti** (~iúoja, ~iãvo) лічыць, вылічваць, рабіць разлікі

skaĩčius (2) лік; колькасць

skáid|yti (~o, ~ė) раскладаць; драбніць; расшчапляць

skaidrẽ (4) слайд

skaidrė́|ti (~ja, ~jo) праясняцца, святлець

skáidrin|ti (~a, ~o) асвятляць, прасвятляць

skaidrùs (4) ясны; светлы; празрысты

skáidula (1) валакно; фібра

skáinio|ti (~ja, ~jo) ірваць, адрываць, абрываць

skaistalaĩ (3^b^) *мн. л.* румяны

skaistė́|ti (~ja, ~jo) *гл.* skaidrẽti

skaist|yklà (2) чысцец; **~ùs** (4) светлы; свежы; некрануты, цнатлівы

skait|yklà (2) чытальня; **~ỹklė** (2) электронная кніжка (*прылада для чытання*); **~ìklis** (2) лічнік (*у матэматыцы*); лічыльнік (*прыбор*); **~ýti** (skaĩto, skaĩtė) чытаць; **~ýtis** (skaĩtosi, skaĩtėsi) лічыцца; **~ýtojas** (1) чытач; **~ytùvas** (2) *гл.* skaitỹklė; **~menìnis** (2) лічбавы

skaĩ̃tmenin|ti (~a, ~o) алічбоўваць

skaitmuõ (3^b^) лічба

skaĩtvardis (1) лічэбнік

skalà (4) лучына; гонта

skal|áuti (~áuja, ~ãvo) паласкаць; абмываць

skalb|ė́ja (1) прачка; **~yklà** (2) пральня; **~ỹklė** (2) пральная машына; **~ìmas** (2) пранне; **~iniaĩ** (1) *мн. л.* бялізна

skal̃b|ti (~ia, ~ė) праць, мыць (*пра бялізну*)

skaldà (4) друз, шчабёнка

skáld|yti (~o, ~ė) сячы; калоць;

разбіваць; *гл. тс.* skáidyti; **~ytojas** (1) камяняр

skalìkas (2) выжал, хорт

skãl|yti (~ija, ~ijo) скавытаць, выць

skãl|sùs (4) ашчадны; разлічаны на доўгі час; **~ū̃nas** (2) сланец, лупняк

skam̃balas (3^b) звано(ча)к

skamb|esỹs (3^b) гучанне, звон; **~ė́ti** (skam̃ba, ~ė́jo) гучаць; звінець; чуцца

skam̃bin|ti (~a, ~o) званіць; граць (*на чым-н.*)

skamb|ùs (4) звонкі, гучны; **~ùtis** (2) званок

skan|áuti (~áuja, ~ãvo) *гл.* ragáuti

skandìn|ti (~a, ~o) тапіць, затапляць

skanė̃stas (2) ласунак; далікатэс

skanìklis (2) харчасмакавая дабаўка (*натуральная або сінтэтычная*)

skãnin|ti (~a, ~o) дадаваць смаку

skan|umýnai (1) *мн. л.* прысмакі; **~ùs** (4) смачны; апетытны

skãpt|as (2) разец; малое долата; **~úoti** (~úoja, ~ãvo) выдзёўбваць

skar|à (4) вялікая хустка, хуста; **~dà** (4) бляха

skar̃das (4) рэха, водгулле

skard|ìnė (2) бляшанка; **~ìnis** (2) бляшаны; **~ė́ti** (skar̃di, ~ė́jo) гучаць; чуцца

skar̃dis (2) круча, строма, абрыў

skardùs (4) I *гл.* skambùs; II стромы, стромкі

skar̃malas (3^b) ануча; рыззё, лахманы

skatìkas (2) грош, дробная манета

skãtin|ti (~a, ~o) падбіваць (*на што-н.*), заахвочваць, стымуляваць

skaudė́|ti (skaũda, ~jo) балець

skaũdin|ti (~a, ~o) прычыняць боль, рабіць балюча

skaud|ulỹs (3^b) болька, нарыў; **~ùs** (4) балючы; балесны

skaũsmas (4) боль

skausmìngas (1) балючы; болевы

skélb|ti (~ia, ~ė) абвяшчаць; прапаведаваць, прамаўляць казані

skelbìmas (2) абвестка, аб’ява

skélti (skẽlia, skė́lė) рассякаць, сячы; разбіваць

skenãvimas (1) сканаванне; прасвечванне

skénd|ėti (~i, ~ėjo) гразнуць; патанаць

skenduõlis (2) тапелец

skèneris (1) сканер

skenogramà (2) скан

skẽpeta (1) *гл.* skarà
sker|díena (1) туша; **~dìkas** (2) разнік, мяснік; **~dyklà** (2) рэзня, разніца; **~dỹnės** (2) *мн. л.* бойня, разня, разаніна
skėrỹs (4) саранча
skeȓs|as (4) папярэчны; **~gatvis** (1) завулак
skers|ìnis (2) I *прым. гл.* skeȓsas; II турнік, папярэчына, перакладзіна; **~muõ** (3^b) дыяметр; папярэчнік
skeȓs|pjūvis (1) папярэчны разрэз; **~vėjis** (1) скразняк, пройма, продзімень
skeȓ|sti (~džia, ~dė) рэзаць; біць
skę̃s|ti (~ta, skeñdo) патанаць
skė̃|sti (skė̃čia, ~tė) рассоўваць; раскідваць; пашыраць; расстаўляць; **~tis** (2) I (рассоўны) парасон; II суквецце
skevéldra (1) кавалак; аскалёпак; камлыга
skiáutė (1) абрэзак, кавалак, шматок
skiauterẽ (3^b) грэбень; кіль
skỹd|as (2) шчыт; **~liaukė** (1) шчытападобная залоза
skiẽdalas (3^b) ветрагон, пасвісцёл
skied|ìklis (2) растваральнік, распушчальнік; **~inỹs** (3^b) раствор (*будаўнічы*)
skiedr|à (3) I трэска; габлюшка; II гонта; **~ìnis** (2) гонтавы
skie|menìnis (2) складавы, складаўтваральны; **~muõ** (3^b) склад (*у слове*)
skiẽp|as (4) I флянс; II прышчэпка; **~yti** (~ija, ~ijo) прышчапляць
skíe|sti (~džia, ~dė) разбаўляць, разводзіць
skilándis (1) шкілондзя (*тоўстыя каўбасы з вантробаў, крыві і мяса*)
skylẽ (4) дзірка; адтуліна
skỹlmuša (1) дзюракол
skìl|ti (skỹla, ~o) лопацца; развальвацца, распадацца; **~tis** (1) доля; рубрыка; графа; **~tuvas** (1) крэсіва; баёк, бойнік (*у зброі*)
skilv|ẽlis (2) жалудачак, шлуначак; **~ỹs** (4) страўнік
skìn|ti (~a, skýnė) ссякаць, сячы; зрываць
skyrýb|a (1) пунктуацыя; **~os** (1) *мн. л.* развод
skỹrius (2) аддзел; аддзяленне; раздзел
skiȓpstas (2) граб
skìrs|nis (1) раздзел; **~tyti** (~to, ~tė) дзяліць, падзяляць; прызначаць; **~tytojas** (1) размяркоўнік, раздатчык
skìr|ti (~ia, skýrė) падзяляць; адрозніваць; **~tis** (~iasi, skýrėsi) адрозніваецца; падзяляцца; расставацца; разводзіцца

skirt|ýbė (1) разнавіднасць; **~ìngas** (1) адрозны
skìrtumas (1) (ад)рознасць; розніца
skýstas (3) вадкі
skyst|ė́ti (~ė́ja, ~ė́jo) вадчэць; **~ìmas** (2), **skỹstis** (2) вадкасць
skýstin|ti (~a, ~o) рабіць вадчэйшым, разбаўляць
sklaidýti (sklaĩdo, sklaĩdė) развяваць; рассейваць; трапаць
skland|ýti (sklañdo, sklañdė) планіраваць, плаўна спускацца, лунаць; **~ýtojas** (1) планерыст; **~ytùvas** (2) планёр; **~ùs** (4) плаўны; бесперабойны
sklãstymas (1) прабор
sklą̃stis (2) засаўка, клямар
skleĩ|sti (~džia, ~dė) пашыраць, распаўсюджваць; раскладаць
sklendẽ (4) *гл.* sklą̃stis
sklę̃sti (skleñdžia, skleñdė) I *гл.* sklandýti; II зачыняць на засаўку
skliaũstas (2) дужка
skliaustẽliai (2) *мн. л.* дужкі
skliaũtas (2) скляпенне
sklìdinas (3^b) перапоўнены
skliñdis (2) блін
sklỹpas (2) участак зямлі, дзялка
sklì|sti (skliñda, ~do) пашырацца, разыходзіцца, разносіцца
skõb|ti (~ia, ~ė) дзяўбці, выдзёўбваць

skol|à (4) пазыка; **~ìngas** (1) вінен, вінаваты (*пра пазыку*)
skõlininkas (1) пазычальнік, даўжнік
skolinỹs (3^b) запазычанне
skõlin|ti (~a, ~o) пазычаць; **~tojas** (1) пазыкадаўца, крэдытор
skonìklis (2) *гл.* skanìklis
skonìngas (1) густоўны, з густам
skõnis (2) густ; смак
skrãdžiai наскрозь, навылёт
skraidỹklė (2) дэльтаплан
skraidýti (skraĩdo, skraĩdė) лятаць
skraĩdlentė (1) паветраны скейтборд
skraĩstė (2) *гл.* skarà
skrajó|ti (~ja, ~jo) *гл.* skraidýti
skránda (1) кажух
skrañdis (2) *гл.* skilvỹs
skrebùtis (2) грэнка, тост
skrepl|iaĩ (4) *мн. л.* макрота, флегма; **~iúoti** (~iúoja, ~iãvo) харкаць
skriaud|à (4) крыўда; **~ė́jas** (1), **~ìkas** (2) крыўдзіцель
skriaũ|sti (~džia, ~dė) крыўдзіць
skrybėlẽ (3^a) капялюш
skrỹdis (2) палёт
skriestùvas (2) цыркуль
skríe|ti (~ja, ~jo) ляцець (*у розн. знач.*); кружыць, кружляць

skrỹsčiai (2) *мн. л.* талевы блок
skrì|sti (skreñda, ~do) ляцець
skritulỹs (3^b) круг, кола
skrõblas (2) *гл.* skir̃pstas
skró|sti (~džia, ~dė) разразаць, рассякаць, трыбушыць
skrùdin|ti (~a, ~o) падсмажваць
skrudintùvas (2) тостар
skrúostas (3) шчака
skruostìkaulis (1) скулавая костка
skruzd|ė̃ (4), **~ėlė̃** (3^b) мураш(ка); **~ėlýnas** (1), **~ýnas** (1) мурашнік
skubé|ti (skùba, ~jo) спяшацца
skùbin|ti (~a, ~o) прыспешваць, падганяць
skub|ótas *дзеепрым.* паспешлівы; **~ùs** (4) пільны, тэрміновы
skùduras (3^b) *гл.* skar̃malas
skudùrlėkis (1) параплан
skudùtis (2) жалейка, дудка
skujà (4) шышка
skuñdas (2) скарга
skundìkas (2) кляўзнік; даносчык
skur̃d|as (2) галеча; **~inti** (~ina, ~ino) прыводзіць да галечы
skurdùs (4) бедны; убогі; варты жалю
skur̃|sti (~sta, ~do) жыць у галечы
skustagal̃vis (2) брытагаловы
skù|sti (~ta, ~to) галіць
skų́sti (skùndžia, skùndė) скардзіцца, даносіць (*на каго-н.*)
skustùvas (2) брытва
skvarbùs (4) праніклівы; пранізлівы
skver̃b|tis (~iasi, ~ėsi) прабірацца, пранікаць, залазіць
skver̃nas (4) крысо
slánkio|ti (~ja, ~jo) швэндацца, цягацца
slankstẽlis (2) пазванок
slapčià, slapčiomìs (па)таемна, пакрыёма
slapývardis (1) псеўданім
slapstýti (slãpsto, slãpstė) хаваць, утойваць
slãptas (4) (па)таемны
slapt|ãvietė (1) схованка, тайнік; **~ãžodis** (1) пароль; **~ìngas** (1) *гл.* slãptas
slaugà (4) догляд
slaũgė (2) сядзелка; санітарка
slaugýti (slaũgo, slaũgė) даглядаць (*хворага*)
slė̃g|is (2) ціск; **~ti** (slẽgia, ~ė) ціснуць
slė̃nis (2) даліна, яр
sleñkstis (2) парог
slėp|ỹnė (2) *гл.* slaptãvietė; **~inìngas** (1) таямнічы; **~inỹs** (3^b) таямніца
slė̃p|ti (slẽpia, ~ė) хаваць, прыхоўваць
slėptùvė (2) схованка

slìbinas (3^b) цмок
slìdės (2) *мн. л.* лыжы
slidinė́|ti (~ja, ~jo) хадзіць на лыжах; слізгаць
slìdininkas (1) лыжнік
slidùs (4) слізкі, коўзкі
slíekas (3) чарвяк (*у розн. знач.*)
sliñk|ti (sleñka, ~o) паўзці; рухацца; працякаць
slypė́|ti (slỹpi, ~jo) хавацца, прытойвацца; палягаць
slý|sti (~sta, ~do) слізгаць, коўзаць
slyvìnis (2) слівовы
slog|ùs (4) цяжкі, неадольны; **~ùtis** (2) кашмар
slopìn|ti (~a, ~o) душыць; здушваць, тлуміць
slopùs (4) задушлівы; цяжкі
slū̃g|ti (~sta, ~o) спадаць, сыходзіць, слабець
slúoksn|inis (1) слаісты; **~is** (1) слой, пласт; **~iúotas** *дзеепрым. гл.* slúoksninis; **~iúoti** (~iúoja, ~iãvo) напластоўваць
smãg|inti (~ina, ~ino) весяліць, цешыць; **~ratis** (1) махавік
smagur|iáuti (~iáuja, ~iãvo) ласавацца
smag|ùris (2) *гл.* skanė̃stas; **~ùs** (4) прыемны, вясёлы; зручны
smaigalỹs (3^b) вастрыё
smaĩgas (4) жэрдка, шост; тычка
smaigýti (smaĩgo, smaĩgė), **smaigstýti** (smaĩgsto, smaĩgstė) утыкаць
smailė́|ti (~ja, ~jo) завастрацца
smaĩlin|ti (~a, ~o) завастраць; вастрыць
smail|umà (3^b) *гл.* smaigalỹs; **~ùs** (4) востры; з’едлівы
smãkras (4) падбароддзе
smaliž|iáuti (~iáuja, ~iãvo) *гл.* smaguriáuti
smalìžius (2) I указальны палец; II ласун
smal̃kės (2) *мн. л.* чад, курадым
smals|áuti (~áuja, ~ãvo) быць цікаўным; **~uõlis** (2) цікаўны (чалавек); **~ùs** (4) цікаўны
smardìn|ti (~a, ~o) смуродзіць
smark|áuti (~áuja, ~ãvo) шалець; **~ė́ti** (~ė́ja, ~ė́jo) мацнець, узмацняцца
smar̃kin|ti (~a, ~o) узмацняць; павялічваць
smark|uõlis (2) запальчывы чалавек; **~ùs** (4) рэзкі; хуткі; моцны
smárvė (1) смурод
smáug|ti (~ia, ~ė) душыць; прыгнятаць
smaũk|ti (~ia, ~ė) насоўваць; закасваць
smẽg|enys (3^b) *мн. л.* I мазгі; мозак; II дзясны; **~ti** (smeñga, ~o) асядаць, грузнуць, правальвацца

smeĩg|ti (~ia, ~ė) *гл.* smaigýti
smeigtùkas (2) кнопка (*канцылярская*)
smėlė́tas *дзеепрым.* пясчаны
smė̃l|inis (2) пясковы; пясочны; **~is** (2) пясок
smer̃k|ti (~ia, ~ė) асуджаць
smigìnis (2) дартынг (*гульня*)
smìg|ti (smiñga, ~o) I уцінацца; II пікіраваць
smìl|ga (1) мятліца (*зёлкі*); **~ius** (2) *гл.* smalìžius
smilk|alaĩ (3^b) *мн. л.* тым'ян, фіміям; **~inỹs** (3^b) скронь; **~ýti** (smil̃ko, smil̃kė) кадзіць, акурваць тым'янам; **~ytùvas** (2) кадзіла
smil̃k|ti (~sta, ~o) дыміцца, тлець, курэць, курыцца
smiltỹnė (2) пяскі, пясчаная мясціна
smiltìs (4) *гл.* smė̃lis
smìr|sti (~sta, ~do) смярдзець
smogìkas (2) штурмавік
smõg|ti (~ia, ~ė) біць; хвастаць
smū̃gis (2) удар
smūg|iúoti (~iúoja, ~iãvo) наносіць удары
smuĩk|as (2) скрыпка; **~ininkas** (1) скрыпач
smuik|úoti (~úoja, ~ãvo) граць на скрыпцы
smukčió|ti (~ja, ~jo) спадаць, звальвацца, саслізгваць
smukdýti (smùkdo, smùkdė) руйнаваць, нішчыць
smùkl|ė (2) карчма, шынок; **~ininkas** (1) карчмар, шынкар
smùk|ti (smuñka, ~o) спадаць, спаўзаць; асядаць
smulkė́|ti (~ja, ~jo) драбніцца; меншаць
smùlkmen|a (1) драбніца, драбяза; падрабязнасць; **~iškas** (1) I дробязны; II падрабязны
smùlkus (3) дробны
smùrtas (1) гвалт
smurt|áuti (~áuja, ~ãvo) ужываць гвалт; гвалціць
smur̃tininkas (1) гвалтаўнік
snaĩgė (2) сняжынка
snãpas (4) дзюба
snargl|ỹs (1) смаркачы; сопля; **~iúotas** *дзеепрым.* смаркаты; **~iúoti** (~iúoja, ~iãvo) абсморкваць
snaudulỹs (3) дрымота, санлівасць
snáu|sti (~džia, ~dė) драмаць
sniegãgniūžtė (1) снежка
sniẽginas (3^b) заснежаны, засыпаны снегам
snieg|ìnis (2) снежны; **~uõlė** (2) *гл.* snaĩgė; **~úotas** *дзеепрым.* заснежаны
snigìmas (2) снегапад
snìg|ti (sniñga, ~o) ісці (*пра снег*), сняжыць
snùkis (2) пыса, храпа

snùstelė|ti (~ja, ~jo) крыху паспаць, перадрамаць

sõdas (2) сад

sod|ýba (1) сядзіба; **~iẽtis** (2) вясковец, селянін

sõdininkas (1) садоўнік

sodìnimas (1) пасадка (*дрэў*)

sod|ininkỹstė (2) садоўніцтва; **~ìnti** (~ìna, ~ìno) садзіць

sódr|inti (~ina, ~ino) насычаць; узбагачаць; **~us** (3) багаты, пышны; сакавіты

sõdžius (2) сяло; вёска

sopulìngas (1) балесны, пакутлівы

sopulỹs (3ª) боль

sóra (1) проса

sóst|as (1) трон, сталец; **~inė** (1) сталіца

sót|inti (~ina, ~ino) насычаць; **~us** (3) сыты

spãlis (2) I кастрыца; II кастрычнік

spalv|à (4) колер; афарбоўка; масць; **~ìngas** (1) маляўнічы

spal̃vin|ti (~a, ~o) расфарбоўваць; расквечваць

spalvótas *дзеепрым.* каляровы

spañguolė (1) журавіны

spárd|yti (~o, ~ė) брыкаць

spar̃nas (4) крыло, скрыдла; фланг

sparn|ìnis (2) крылаты; флангавы; **~úotas** *дзеепрым.* крылаты

spart|à (4) хуткасць, шпаркасць, тэмп; **~ė́ti** (~ė́ja, ~ė́jo) паскарацца

spar̃tin|ti (~a, ~o) паскараць, дадаваць хуткасці

spartùs (4) хуткі; хуткасны; спорны

spaudà (4) друк; прэса

spaũdas (4) штамп; таўро

spaudyklà (2) алейны завод, алейня

spaudinỹs (3ª) друкаванае выданне

spáusdin|ti (~a, ~o) друкаваць

spausdintùvas (2) друкарка, прынтар

spáu|sti (~džia, ~dė) ціснуць; націскаць; прыгнятаць; **~stis** (~džiasi, ~dėsi) ціснуцца; сціскацца

spaustùv|ė (2) друкарня; **~ininkas** (1) друкар

spéigas (1) сцюжа, моцны мароз

speig|ìratis (1) палярнае кола; **~úotas** *дзеепрым.* марозны, сцюдзёны

spėliõnė (2) домысел, меркаванне, здагадка

spėlió|ti (~ja, ~jo) дадумваць

speñg|ti (~ia, ~ė) звінець; гусці; вішчаць

spenỹs (4) смочка, сысок, музок

spę́sti (spéndžia, spéndė) ставіць сіло (пастку)

spė́|ti (~ja, ~jo) I пасляваць; II адгадваць

spiẽčius (2) рой

spiẽg|ti (~ia, ~ė) пранізліва віскатаць

spiẽ|sti (~čia, ~tė) раіцца; засяроджваць, канцэнтраваць

spìgin|ti (~a, ~o) I сляпуча свяціць; II моцна марозіць

spygl|ỹs (4) ігліца; **~iúotas** *дзеепрым.* калючы; хваёвы, ігліцавы

spynà (4) замок

spind|esỹs (3[b]) бляск, ззянне; **~ė́ti** (spiñdi, ~ė́jo) зіхцець, ззяць; блішчаць

spindul|ìnis (2) прамянёвы; **~ỹs** (3[b]) прамень; **~iuõti** (~iúoja, ~iãvo) ззяць; выпрамяняць

spìnta (1) шафа

spìrgas (3) скварка

spirgė́|ti (~ja, ~jo) смажыцца

spìrgin|ti (~a, ~o) смажыць

spirgintùvė (2) патэльня

spìr|ti (~ia, spýrė) пінаць; падпіраць; *гл. тс.* spárdyti; **~tis** (~iasi, spýrėsi) упірацца, супраціўляцца

spyruõkl|ė (2) спружына; **~inis** (1) спружынавы

spyruokl|iúoti (~iúoja, ~iãvo) спружыніць

